Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 чэрвеня 2012 г. ЧАЦВЕР № 123 (27238) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ён аднолькава добра праяўляе сябе ў жывапісе, паэзіі, музыцы, раніцай апавядае пра асаблівасці беларускай мовы, з'яўляецца цікавай асобай і шчырым суразмоўцам.** СТАР. 4



**Славуты цяжкаатлет Леанід Тараненка зараз працуе дырэктарам прадстаўніцтва НАК у Мінску. Пра сваю работу, будучую Алімпіяду і веру ў Арамнава ён распавёў карэспандэнту «Звязды».** СТАР. 6



**Вікторыя над славакамі — толькі прыступка на шляху да адраджэння айчыннага гандбола. Аднаўляць яго дапамагае Юрый Шаўцоў, славуты ў мінулым гулец, сёння — вядомы ў Еўропе гандбольны спецыяліст.** СТАР. 6

# БЕЛАРУСЬ І ВЕНЕСУЭЛА НАДОЎГА ЗАКЛАЛІ АСНОВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Прэзідэнты Беларусі і Венесуэлы Аляксандр Лукашэнка і Уга Чавес бачаць шырокія магчымасці для нарошчвання беларуска-венесуэльскіх сувязяў і маюць намер штогод інтэнсіфікаваць адносіны. Аб гэтым заявілі кіраўнікі дзяржаў на сустрэчы ў Каракасе.**



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес, чакаючы прыбыцця ў Палац Мірафлорэс свайго беларускага калегі, ва ўласцівай яму манеры паразмаўляў з прысутнымі журналістамі, падзякаваў беларускаму народу за дапамогу ў развіцці Венесуэлы, звярнуў увагу на высокую якасць беларускай прадукцыі.

Калі да палаца пад'ехаў картэж беларускага лідара, Уга Чавес цёпла прывітаў Аляксандра Лукашэнку і папрасіў паклікаць яго сына Мікалая. Падкрэсліваючы асаблівы характар дружалюбных адносін з беларускім лідарам, Прэзідэнт Венесуэлы настаяў на тым, каб у Палац Мірафлорэс Аляксандр Лукашэнка ўзяў свайго малодшага сына.

Пасля кароткага абмену прывітаннямі лідараў дзвюх дзяржаў пачалася цырымонія афіцыйнай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі, якая трансліравалася ў прамым эфіры венесуэльскага тэлебачання. Ваенны аркестр Венесуэлы выканаў Дзяржаўны гімн Беларусі, пры гэтым рота ганаровай варты праспявала яго. Пасля выканання гімнаў Уга Чавес зноў адышоў ад пратакола і спецыяльна для венесуэльскай аўдыторыі ахарактарызаваў двухбаковае супрацоўніцтва з Беларуссю. «На працягу апошніх гадоў мы выбудавалі не проста стратэгічны саюз, а брацтва», — адзначыў венесуэльскі лідар. Звяртаючыся да Аляксандра Лукашэнкі, ён згадаў аб яго візіце на Кубу і звярнуў увагу на намеры Беларусі пашыраць узаемаадносіны з краінамі Лацінскай Амерыкі і, у прыватнасці, з АЛБА (альянс краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна).

Уга Чавес падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за візіт у Венесуэлу, а таксама перадаў прывітальныя словы працавітаму, сціпламу, вясёламу і гераічнаму народу Беларусі. Ён падкрэсліў, што прэзідэнтам трэба будзе разгледзець мноства праектаў, якія ўжо рэалізуюцца, у прыватнасці ў сферах здабычы нафты, газу, нафтахіміі, будаўніцтва жылля, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, энергетыкі і газіфікацыі.

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу запэўніў, што ўсе дамоўленасці, якія былі заключаны Беларуссю і Венесуэлай, будуць выкананы датэрмінова.

«Некаторыя пачалі сумнявацца ў сур'ёзных перспектывах супрацоўніцтва Беларусі і Венесуэлы, але мы сур'ёзна і надоўга заклалі асновы супрацоўніцтва», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што Беларусь прыйшла ў Венесуэлу для аказання дапамогі ў развіцці краіны. «Мы сярэднееўрапейская краіна, у нас шмат месцаў прыкладання працы, але мы хочам часцінку сябе пакінуць тут, у Венесуэле. Мы прыйшлі сюды не як каланізатары. Мы будуем прадпрыемствы, жыллё, навучаем венесуэльцаў», — сказаў беларускі лідар. «Рашэнне аб дыверсіфікацыі эканомікі, праз гады, людзі ацэняць як подзвіг», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Уга Чавеса.

Уга Чавес таксама расказаў аб сваёй размове з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, які на той момант знаходзіўся з візітам у Ізраілі. Венесуэльскі лідар станоўча ацаніў той факт, што Уладзімір Пуцін зрабіў свой першы візіт у якасці кіраўніка расійскай дзяржавы менавіта ў Беларусь. Прэзідэнт Венесуэлы чарговы раз падзякаваў беларускаму боку за перадачу венесуэльцам тэхналогій і навучанне спецыялістаў. СТАР. 2

# ЯК УТРЫМАЦЬ У СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ?

**Чаму ўсё менш маладых людзей, якія жадаюць працаваць у школе? Як вырашыць праблему хранічнага дэфіцыту кадраў у дашкольных установах? Чаму ў педагогаў дашкольных устаноў не заўсёды хапае часу на дзяцей? Як можа адбіцца на кадравай сітуацыі пераход на чатырохгадовыя тэрміны навучання ў ВНУ? Гэтыя і многія іншыя пытанні і праблемы ўздымаліся на пленуме Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, які адбыўся ў Мінску.**

Як адзначыў у сваёй прамове **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА**, палеміка, што разгарнулася на шэрагу сайтаў адносна памераў заработнай платы настаўнікаў, сведчыць аб тым, што ў грамадстве прысутнічае разуменне, што кошт працы педагагічных работнікаў трэба павышаць. Зараз, з улікам павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду, сярэднямесячная заработная плата ў галіне складае 2 666 900 рублёў (або 327 долараў). У тым ліку ў настаўнікаў — 3 198 600 рублёў (або 392 долары) і ў прафесарска-выкладчыцкага саставу — 4 502 200 рублёў (552 долары).

— Аднак трэба мець на ўвазе, што гэты паказчык улічвае перапрацоўку, знешняе і ўнутранае сумяшчальніцтва. Трэба таксама разумець, што ў бліжэйшы час магчымасці ўзяць дадатковую нагрузку, па прычыне дэмаграфічнай сітуацыі, у педагогаў будуць мінімальныя, — падкрэсліў Аляксандр Бойка. СТАР. 2



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАРПАЎ, дэкан гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта:**

***Беларуская мова ўжо даўно выкладаецца на філалагічным факультэце МДУ. Цяпер гэтая дысцыпліна ўключана і ў праграму студэнтаў, якія вывучаюць гісторыю постсавецкіх краін. Нельга вывучаць гісторыю краіны без ведання яе мовы. Таму кожны студэнт, які ў нас вывучае гісторыю Беларусі, вывучае і беларускую мову.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 19° |
| Віцебск | + 17° |
| Гомель | + 18° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | + 17° |
| Мінск | + 17° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.06.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8340,00 | ▼ |
| Еўра | 10420,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 254,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1032,37 | ▲ |

# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПЛАНУЕЦЦА ЎДАСКАНАЛІЦЬ

**Аб гэтым паведаміў учора ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу міністр інфармацыі Алег Пралясқоўскі, перадае БЕЛТА.**

Міністр інфармацыі прадставіў дэпутатам законапраект «Аб выдавецкай справе ў Беларусі», які затым быў прыняты парламентарыямі ў першым чытанні. Судакладчыкам міністра выступіла член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Алена Новік.

«Распрацоўка законапраекта з'яўляецца першай спробай за час існавання нашай краіны рэгламентацыі на ўзроўні заканадаўчага акта ўсіх этапаў па ажыццяўленні выдавецкай справы: ад стварэння, вытворчасці выдавецкай прадукцыі да яе распаўсюджвання», — адзначыў Алег Пралясқоўскі.

Паводле яго слоў, аналіз дзейнага заканадаўства прывёў да высновы, што існуючыя нормы не забяспечваюць у поўнай меры комплекснага рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні выдавецкай справы. Да гэтага часу на заканадаўчым узроўні не вызначаны такія асноўныя паняцці, як «выдавецкая справа», «суб'екты выдавецкай справы», «выдавец», «вытворца», «заказчык», «распаўсюджвальнік выдавецкай прадукцыі», «дзяржаўны рэестр выдаўцоў», падкрэсліў Алег Пралясқоўскі.

«Пры аналізе тэарэтычных аспектаў прававога рэгулявання выдавецкай дзейнасці былі вызначаны асноўныя праблемы, якія патрабуюць вырашэння пры распрацоўцы праекта закона. Гэта, у першую чаргу, праблемы, звязаныя з функцыянаваннем выдавецкай сферы як адзінага механізму, які ўключае ў сябе падрыхтоўку, выраб і распаўсюджванне выдавецкай прадукцыі. Вырашэнне акрэсленага кола праблем магчыма толькі на ўзроўні заканадаўчага акта», — упэўнены міністр інфармацыі.

Міністэрствам інфармацыі Беларусі вывучаны замежны вопыт у сферы рэгулявання выдавецкай справы. Прааналізавана заканадаўства дзяржаў — удзельніц СНД, прапрацаваны мадэльны закон аб выдавецкай справе, прыняты на міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД. З дапамогай МЗС падрыхтаваны вялікі аналіз заканадаўства аб выдавецкай дзейнасці і ў іншых краінах. СТАР. 2

# У Дзень Незалежнасці міжгароднія званкі для ветэранаў — бясплатныя

**Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны атрымаюць у Дзень Незалежнасці магчымасць бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў унутры краіны. Падарунак зробіць ветэранам РУП «Белтэлекам». Акцыя распачнецца 3 мая ў 0.00 гадзін і будзе доўжыцца да поўначы.**

Бясплатныя міжгароднія тэлефонныя размовы будуць прадастаўлены Героям Савецкага Саюза; поўным кавалерам ордэна Славы; інвалідам Вялікай Айчыннай вайны; удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны; асобам, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах; асобам, узнагароджаным ордэнамі і (ці) медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады ВАВ; асобам, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых межаў дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгункі і аўтамабільных дарог; членам экіпажаў суднаў транспартнага флоту, інтэрнаваным у пачатку вайны ў партах іншых дзяржаў; асобам, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года і былі ўзнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда», і асобам, узнагароджаным знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда»; інвалідам з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтваў, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай або з наступствамі ваенных дзеянняў, якія дасягнулі: мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў.

Бясплатныя міжгароднія званкі можна будзе зрабіць аўтаматычным спосабам або з дапамогай тэлефаніста. Заказаць бясплатныя тэлефонныя размовы з дапамогай тэлефаніста ва ўсіх гарадах і абласцях можна будзе па нумарах 8-18 (для абанентаў Брэста і Брэсцкай вобласці, Віцебска і Віцебскай вобласці, Мінска і Мінскай вобласці, Магілёва і Магілёўскай вобласці) і 8-13 (для абанентаў Гомеля і Гомельскай вобласці, Гродна і Гродзенскай вобласці, а таксама Мінска і Мінскай вобласці).

Дадатковая інфармацыя па арганізацыі бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў будзе прадастаўляцца па тэлефонах адзінай даведачна-інфармацыйнай службы 153 і 130 (даведка бясплатная). Акцыя не распаўсюджваецца на мясцовыя тэлефонныя размовы з абанентамі сотавых сетак, пры доступе ў інтэрнэт, а таксама пры карыстанні платнымі даведачна-інфармацыйнымі службамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**29 чэрвеня 2012 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» информирует, что с 28 июня 2012 года**

**процентные ставки по срочным банковским вкладам (депозитам) физических лиц в белорусских рублях установлены в следующих размерах:**

– по срочному банковскому накопительному вкладу — в размере **36% годовых** *(по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер процентной ставки применять, начиная с 28.07.2012);*

– по срочному банковскому вкладу «Гарантированный доход» на 15 дней — в размере **18% годовых** *(по ранее принятым вкладам установленный размер процентной ставки применять с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 28.06.2012);*

– по вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 15 дней — в размере **18% годовых**, со сроком обращения 2 месяца — **26% годовых**;

– по срочному банковскому вкладу «Престиж» — **26% годовых** *(применять с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 28.06.2012).*

**Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by**

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЛІТВА ВЫРАШЫЛА ПАШУКАЦЬ У СЯБЕ СЛАНЦАВЫ ГАЗ

Геалагічная служба Літвы абвясціла міжнародны конкурс на пошук і здабычу сланцавага газу на тэрыторыі краіны, паведамляюць інфармагенцтвы. Міністэрства энергетыкі спадзяецца, што ў выпадку, калі здабыча сланцавага газу ў Літве акажацца эканамічна выгаднай і акупляльнай, ён зможа скласці салідную канкурэнцыю прыроднаму газу, які пастаўляецца ў Літву «Газпрамам». Конкурс будзе доўжыцца да 25 верасня. Паводле папярэдняй інфармацыі, залежы сланцавага газу ў Літве могуць складаць 100-120 млрд кубаметраў. Гэтага аб'ёму хопіць краіне на 30-40 гадоў.

### У КРЫМЕ ГАРЫЦЬ ЯЛЦІНСКІ ЗАПАВЕДНІК



У гарах Крыма гарыць лес Ялцінскага прыроднага запаведніка. Ратавальнікі пачалі эвакуацыю людзей з небяспечных месцаў. Як паведаміла прэс-служба рэспубліканскага ўпраўлення МНС Крыма, пажар пачаўся ў ноч на 27 чэрвеня ў цясніне Уч-Кош. Маланка ўдарыла ў дрэва, якое загарэлася, і ад яго полымя перакінулася на астатні хвойны і ядлаўцовы лес. Паводле апошняй інфармацыі, пажар ахапіў каля двух гектараў лесу на тэрыторыі Ялцінскага горна-ляснога запаведніка, з агнём змагаюцца больш за 250 чалавек. Бліжэйшыя населеныя пункты завалакло дымам, ратавальнікі пачалі эвакуацыю дзяцей і старых з небяспечных месцаў. Тушэнне агню абцяжарвае цяжкадаступная мясцовасць і моцны вецер. З-за пажару ў раёне ўрочышча Уч-Кош закрыта дарога Ялта — Ай-Петры.

### КАБ ЗАСТАВАЦЦА СТРОЙНАЙ НАВАТ У СТАРАСЦІ, ПАТРЭБЕН ВІТАМІН D

Пажылыя жанчыны, якія маюць паніжаную канцэнтрацыю вітаміну D, могуць набраць лішнія кілаграмы. Пра гэта кажа абследаванне больш за 4600 жанчын 65 гадоў і старэй, праведзенае Цэнтрам даследавання здароўя «Кайзер перманентэ». Як перадае WebMD, большасць жанчын, якія прымалі ўдзел у даследаванні, у крыві мелі вітаміну D менш як 30 нанаграмаў на міліметр. Гэта лічыцца недастатковым паказчыкам. А дэфіцыт — ніжэй за 25. Навукоўцы пакуль не могуць сказаць, паніжаная канцэнтрацыя вітаміну з'яўляецца прычынай набору вагі ці проста адлюстроўвае нейкую тэндэнцыю. Магчыма, вітамін D уплывае на ўсыханне тлушчавых клетак. У любым выпадку, спецыялісты раяць часцей знаходзіцца на сонцы, есці тлустую рыбу, сыр, піць малако для падтрымання аптымальнага ўзроўню вітаміну D.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ЕЎРОПЫ НЕ ХОПІЦЬ ГРОШАЙ ДЛЯ ВЫРАТАВАННЯ ЯШЧЭ АДНОЙ КРАІНЫ

**Кіпр стаў пятай краінай зоны еўра, якая звярнулася па знешнюю дапамогу да партнёраў па ЕС. Афіцыйны запыт аб дапамозе ў Брусель накіравала таксама Іспанія, якая, як чакаецца, атрымае 100 млрд еўра. Тых сродкаў, што засталіся ў стабфондзе EFSF, можа не хапіць на сур'ёзную праграму дапамогі якой-небудзь іншай краіне, якая можа сутыкнуцца з фінансавымі цяжкасцямі (напрыклад, Італіі).**

Чакаецца, што аб'ём крэдыту Кіпру складзе 10 млрд еўра — больш за палову ад аб'ёму ВУП краіны. Хутчэй за ўсё, 7 млрд еўра атрымае непасрэдна ўрад краіны, яшчэ 3 млрд еўра пойдуць на дапамогу банкам, паведаміў Reuters еўрапейскі чыноўнік.

Пасля дапамогі Грэцыі, Ірландыі і Партугаліі ў распараджэнні еўрапейскага стабфонду EFSF заставалася 240 млрд еўра. З улікам падтрымкі Іспаніі і Кіпра застанецца ўсяго 130 млрд еўра.

Эксперты мяркуюць, што гэтай сумы будзе недастаткова, калі, напрыклад, па дапамогу будзе вымушана звярнуцца і Італія — трэцяя па велічыні эканоміка зоны еўра з чацвёртым у свеце па велічыні рынкам дзярждоўгу (1,9 трлн).

Цяпер прэм'ер Італіі Марыа Монці запэўнівае, што краіна здольная самастойна выйсці з крызісу, але раней аналагічныя заявы рабілі і ўлады Іспаніі.

■ Парламенцкі дзённік

# ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ ПРЫНЯЛА ЗАКОНАПРАЕКТ АБ АМНІСТЫІ АДРАЗУ Ў ДВУХ ЧЫТАННЯХ

**Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла ўчора ў першым і другім чытаннях праект закона «Аб амністыі некаторых катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынствы», перадае БЕЛТА.**

Міністр унутраных спраў генерал-маёр міліцыі Ігар Шуневіч, выступаючы ў парламенце наконт гэтага законапраекта, адзначыў: «Дзяржава не толькі карае, але і дае магчымасць асуджаным, якія выправіліся, вызваліцца. Адной з праяў гэтага з'яўляецца амністыя». Міністр дадаў, што практыка паказала — амністыя не вядзе да негатыўных наступстваў. Яна прымяняецца да тых, хто кампенсаваў урон, раскаяўся і г.д.

Адказваючы на пытанне дэпутата Ларысы Вершаловіч, міністр таксама растлумачыў, што размова не ідзе аб тым, што адразу пасля вызвалення зняволеных іх месцы будуць штучна заняты новымі асуджанымі. «Мы не лічым, што як толькі выйдуць гэтыя грамадзяне на свабоду, адразу ж адбудзецца запаўненне месцаў», — сказаў Ігар Шуневіч.

Як паведамлялася, дакумент прадугледжвае, што за ўчыненне злачынстваў, якія не адносяцца да цяжкіх, будуць амніставаны непаўналетнія; цяжарныя жанчыны; жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў; асобы пенсійнага ўзросту; інваліды 1-й і 2-й групы; хворыя на актыўныя формы туберкулёзу, аднесеныя да 1-й, 2-й, 5-й «А» або 5-й «Б» груп дыспансэрнага ўліку; анкалагічныя хворыя 2-й, 3-й і 4-й клінічных груп, ВІЧ-інфіцыраваныя з 3-й (прэ-СНІД) і 4-й (СНІД) стадыямі захворвання па клінічнай класіфікацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя; ветэраны баявых дзеянняў і іншыя.

Таксама прадугледжваецца вызваленне ад пакарання асуджаных за крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваенне або растрату, крадзяжы шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі, за злачынствы супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, а таксама за злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі. Але пры гэтым на дзень уступлення ў сілу закона яны павінны адбыць не менш як адну чвэрць назначанага тэрміну.

Акрамя таго, могуць быць вызвалены асобы, у якіх на дзень разгляду матэрыялаў аб прымяненні амністыі да заканчэння тэрміну пакарання застаецца менш як адзін год і іншыя.

Пры гэтым, як і раней, не падлягаюць амністыі асобы (у тым ліку і тыя, якія падпадаюць пад катэгорыі, адзначаныя ў іншых артыкулах законапраекта), якія асуджаны за ўчыненне злачынстваў, што ўяўляюць вялікую грамадскую небяспеку. У тым ліку гэта злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, супраць дзяржавы, супраць жыцця і здароўя, супраць палавой недатыкальнасці. Амніціраваны не будуць і тыя, у дачыненні да каго прымянялася амністыя або памілаванне ў перыяд з 2005 па 2012 год; тыя, хто на дзень уступлення прыгавору ў сілу не кампенсаваў эканамічны ўрон за ўчыненае (акрамя «льготнай катэгорыі»); тыя, чыё пакаранне ў выглядзе смяротнай кары было заменена пажыццёвым зняволеннем і інш. Амністыя не закране тых, хто злосна парушае парадак у папраўчых установах, а таксама дапусціў асабліва небяспечны рэцыдыў злачынстваў.

У цэлым чакаецца, што амністыя закране амаль 7,6 тыс. чалавек. Амаль 2 тыс. з іх плануецца вызваліць непасрэдна з месцаў пазбаўлення волі. Усяго ў Беларусі ўтрымліваецца амаль 37 тыс. зняволеных.

# БЕЛАРУСЬ І ВЕНЕСУЭЛА НАДОЎГА ЗАКЛАЛІ АСНОВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Затым кіраўнікі дзяржаў падрабязна абмеркавалі беларуска-венесуэльскае супрацоўніцтва ў вузкім фармаце, зрабіўшы асаблівы акцэнт на перспектыўных напрамках супрацоўніцтва. Пасля заканчэння размовы прэзідэнты Беларусі і Венесуэлы перайшлі ў залу, дзе іх чакалі члены дэлегацый і іншыя запрошаныя асобы.

Прэзідэнты падвялі кароткі вынік праведзенай сустрэчы. Уга Чавес выказаў задавальненне візітам беларускай дэлегацыі і ўпэўненасць у тым, што ўсе праекты, якія рэалізуюцца з беларускім бокам, будуць выкананы.

Тут жа адбыліся чатыры тэлемасты з рознымі рэгіёнамі Венесуэлы, дзе рэалізуюцца сумесныя з Беларуссю праекты. Першым адбылося прамое ўключэнне з завода па вытворчасці аўтамабіляў МАЗ у штаце Барынас. Гэта прадпрыемства, якое адкрылася месяц таму, арыентавана на выпуск 5 тыс. аўтамабіляў у год. Цяпер на прадпрыемстве сабрана 500 аўтамабіляў, да канца года будзе выпушчана 1 тыс. На праектныя магутнасці завод плануе выйсці ў бліжэйшыя пяць гадоў. Як адзначыў Уга Чавес, прадпрыемства дасць магчымасць насыціць не толькі рынак Венесуэлы, але і прадаваць прадукцыю ў іншыя краіны рэгіёна. Акрамя таго, спатрэбіцца стварэнне новых прадпрыемстваў па абслугоўванні тэхнікі. У сваю чаргу гэта створыць тысячы рабочых месцаў.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што на магутнасцях гэтага завода можна змантаваць лінію па вытворчасці аўтобусаў. «Я шмат чуў аб патрэбнасцях рэгіёна ў такой тэхніцы. У прадпрыемства вялікія перспектывы. Я гарантую, што гэту тэхніку купяць — і ў Нікарагуа, і ў Бразіліі, і ў іншых краінах. Таму побач трэба адкрываць і лінію па выпуску аўтобусаў. Яны таксама будуць запатрабаваны. Падумай!» — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, звяртаючыся да венесуэльскага лідара.

Прэзідэнт Беларусі таксама звярнуў увагу на тое, што пабудаваць прадпрыемствы не так складана, значна цяжэй навучыць людзей тэхналогіям, рабоце на такіх вытворчасцях. «Калісьці я абяцаў табе гэта, і мы гэта зробім: твае людзі атрымаюць такую адукацыю, каб яны маглі працаваць на гэтых высокатэхналагічных вытворчасцях», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Наступны тэлемост звязаў Каракас і Маракай, дзе сіламі беларускіх спецыялістаў вядзецца будаўніцтва жылля. Уладальнікамі новых кватэр у гэты дзень сталі 162 венесуэльскія сям'і. Аляксандр Лукашэнка ўспомніў наведванне гэтага месца ў 2010 годзе, калі кіраўнікі дзвюх дзяржаў заклалі першы камень у будаўніцтва будучага мікраараёна. Праз два гады тут ужо закончаны жыллёвы комплекс. Як расказаў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка, цяпер будуецца яшчэ 4,5 тыс. кватэр. А да канца гэтага года будзе здадзена новым жыльцам больш за 30 дамоў. «Гэта была твая ідэя, — сказаў Уга Чавес, звяртаючыся да Аляксандра Лукашэнкі. — Тут ужо сапраўдны лес дамоў. Такога ў Венесуэле ніколі не было. Будавалі толькі для багатых і сярэднезабяспечаных, астатнія жылі ў беднасці і галечы. Таму мы ўдзячны». Венесуэльскі Прэзідэнт дадаў, што ў іншых частках краіны таксама неабходна ажыццяўляць такое будаўніцтва, і запрасіў беларускіх спецыялістаў дапамагчы ў гэтым.

«Я рад, што людзі атрымалі такі мікраараён. Але гэта толькі пачатак», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Вы заўважылі: у гэтых кватэрах стаіць мэбля, газавыя пліты, халадзільнікі — мы гэта з Беларусі вазіць не павінны. Вы павінны пабудаваць у сябе прадпрыемствы, каб усё гэта выраблялі ў Венесуэле», — падкрэсліў беларускі лідар. «Я хачу, каб гадоў праз пяць мільёны венесуэльцаў табе дзякавалі за гэта жыллё, і мы можам гэта зрабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Уга Чавеса.

Кіраўнікам дзяржаў таксама прадэманстравалі з дапамогай прамых уключэнняў завод керамічных блокаў у штаце Міранда і раён Каракаса, які газіфікуецца беларускімі спецыялістамі.

Уга Чавес выказаў жаданне прадаўжаць сумесную з беларускім бокам работу, адкрываць новыя прадпрыемствы, аказваць дапамогу ў развіцці Венесуэлы.

Пасля заканчэння двухбаковых перагавораў Беларусь і Венесуэла падпісалі больш як два дзясяткі дакументаў, якія пашыраюць супрацоўніцтва краін.

Бакі пацвердзілі намеры пашыраць супрацоўніцтва ў сферах будаўніцтва, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, газіфікацыі, энергетыкі і іншых. У прыватнасці, дасягнута дамоўленасць аб будаўніцтве сіламі беларускіх спецыялістаў з прыцягненнем фінансавання кітайскага боку цеплавой электрастанцыі магутнасцю 600 МВт у штаце Барынас. Плануецца, што станцыя будзе запушчана ўжо ў сярэдзіне 2015 года. На яе ўзвядзенне кітайскі бок выдзеляе амаль $1 млрд. Падпісаны таксама мемарандумы аб узаемаразуменні па праектаванні і будаўніцтве газаправода паміж гарадамі Баркісімета і Барынас, а таксама аб узаемаразуменні па ўстаноўленні другой лініі на цагельным заводзе.

Падводзячы вынікі дня, прэзідэнты падкрэслілі, што Беларусь і Венесуэла поўныя рашучасці штогод нарошчваць супрацоўніцтва.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што сувязі дзвюх краін дынамічна развіваюцца, узаемадзеянне выйшла на ўзровень стратэгічнага партнёрства. «Палітычнае ўзаемаразуменне і давер на вышэйшым узроўні — надзейная аснова для ўмацавання гэтага супрацоўніцтва», — пераканаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на паспяховае ажыццяўленне сумесных праектаў у сферах нафтадабычы, сейсмаразведкі і сейсматэхнікі, газіфікацыі, архітэктуры і будаўніцтва, прамысловасці, сельскай гаспадаркі і многіх іншых. Ён адзначыў узровень тавараабароту, які вырас за апошнія гады на парадкі — з $6 млн у 2006 годзе да амаль $1,5 млрд у 2010 і 2011 гадах. «Мы поўныя рашучасці прадаўжаць гэту маштабную работу і, упэўнены, атрымаем яшчэ больш важкія вынікі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кожны беларус ведае аб Венесуэле і венесуэльцах. «Вы падставілі нам плячо ў самы цяжкі час», — сказаў ён. У пацвярджэнне гэтых слоў Аляксандр Лукашэнка падарыў Уга Чавесу партрэт Сімона Балівара, зроблены беларускім умельцам, які папрасіў пры магчымасці перадаць гэту карціну венесуэльскаму Прэзідэнту з пажаданнем стойкасці, мужнасці і руху наперад.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што напярэдадні візіту ў Венесуэлу цікавіўся меркаваннем венесуэльскага грамадства наконт двухбаковага супрацоўніцтва. «Пераважная большасць венесуэльцаў падтрымліваюць тое, што мы робім з Чавесам. Але ёсць некаторыя таварышы, якія сумняваюцца ў нашым супрацоўніцтве. Напэўна, гэта натуральна, вострыя палітычны момант», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Але хачу яшчэ раз паўтарыць: беларусы да вас прыйшлі як браты, па закліку вашага патрыёта-Прэзідэнта. Гэта мой сябар, сябар беларускага народа. І вы павінны ведаць: хто б што тут ні гаварыў, хто б тут што ні планаваў насуперак, наша дзяржава зробіць усё, аб чым папросіць ён — мой сябар Чавес», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Я ўпэўнены, што праз некалькі гадоў мы будзем гаварыць аб больш сур'ёзных праектах, якія мы рэалізуем назло нашым непрыяцелям. І на гэтым шляху нас ніхто не спыніць. Вось мой кароткі адказ тым, хто яшчэ сумняваецца ў тым, што мы зробім», — дадаў беларускі лідар.

«Той, хто мяне добра ведае, ніколі не скажа, што я ўмею лісліваць. Але скажу прама: не было б цябе — не было б гэтых праектаў і поспехаў. І, напэўна, Беларусі тут, у Венесуэле, таксама не было б. Я не перабольшваю», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, звяртаючыся да Уга Чавеса.

«Я не маю на ўвазе вашы выбары. Я ведаю, што ты іх выйграеш, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я проста хачу аддаць табе даніну павагі і выказаць удзячнасць ад тысяч беларусаў, якія маюць магчымасць тут працаваць і, чаго граху таіць, зарабляць».

Прэзідэнт Беларусі дадаў, што ўжо трэці раз наведвае Венесуэлу і не перастае захапляцца поспехамі на шляху будаўніцтва незалежнай дзяржавы.

Размову кіраўнікі дзяржаў завяршылі позна вечарам, пасля чаго Уга Чавес спецыяльна для венесуэльскіх і міжнародных СМІ выказаўся аб супрацоўніцтве з Беларуссю як выключна важным для Венесуэлы і пацвердзіў яго стратэгічны характар.

Пасля завяршэння афіцыйнага візіту ў Венесуэлу Прэзідэнт Беларусі прадоўжыць работу ў Эквадоры. У цэнтры ўвагі будуць пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, фарміравання дагаворна-прававой базы, пашырэння кантактаў паміж краінамі.

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫБЫЎ З ПЕРШЫМ АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ У ЭКВАДОР

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 чэрвеня прыбыў у Эквадор з першым афіцыйным візітам у гісторыі двухбаковых адносін, перадае БЕЛТА.**

У аэрапорце прайшла цырымонія афіцыйнай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі. Праграмай візіту запланавана ўскладанне Аляксандрам Лукашэнкам вянка да манумента Героям Незалежнасці. Потым адбудзецца сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы з Прэзідэнтам Эквадора Рафаэлем Карэа Дэльгада. Плануецца, што лідары дзвюх краін сустрэнуцца ў вузкім фармаце, затым да іх далучацца члены дэлегацый. Па выніках перагавораў прадугледжваецца падпісанне міжнародных дакументаў.

# ЯК УТРЫМАЦЬ У СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— І зусім не дзіўна, што, адпрацаваўшы належны тэрмін па размеркаванні, сельская моладзь з'язджае ў горад, а гараджане дзеля больш высокіх заробкаў увогуле сыходзяць з галіны. Так, праведзены прафсаюзам у кастрычніку 2011 года маніторынг паказаў, што ў галіне адукацыі працягваюць працаваць 68,5% маладых спецыялістаў, а астатнія, адпрацаваўшы ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін, звальняюцца і пераходзяць на работу ў арганізацыі іншых сфер эканомікі. Цяпер заработная плата маладога педагога ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі складае 1 862 000 рублёў. Але пасля двух гадоў абавязковай адпрацоўкі малады педагог страчвае статус маладога спецыяліста і яго заработная плата становіцца меншай. Ён ужо не атрымлівае даплаты ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду, і яму не ажыццяўляецца 10-працэнтнае павышэнне тарыфнай стаўкі. Ліквідаваць гэтае разыходжанне не можа нават праходжанне атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі.

Па выніках маніторынгу, праведзенага прафсаюзам, у галіне не хапае настаўнікаў матэматыкі, інфарматыкі, фізікі, хіміі, замежных моў, выхавальнікаў, памочнікаў выхавальнікаў, кіраўнікоў па фізічным выхаванні, педагогаў дашкольнай адукацыі, метадыстаў, кухонных работнікаў, абслуговага персаналу. Яно і не дзіўна, бо памер заробкаў у абслуговага персаналу — надзвычай нізкі: заработная плата ў работнікаў, якія тарыфікуюцца па першым разрадзе (прыбіральшчык, дворнік, падсобны рабочы) з улікам надбаўкі за стаж і стымулюючых выплат складае 1 147 400 рублёў, або 97,9% мінімальнага спажывецкага бюджэту. Гэтых грошай не хапае нават на пакрыццё першачарговых выдаткаў.

Вялікай праблемай з'яўляецца і ўзровень заработнай платы ў работнікаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, метадыстаў, работнікаў цэнтралізаваных бухгалтэрый, гаспадарчых груп і шэрагу іншых міжгаліновых спецыялістаў. Так, зарплата педагогаў дадатковай адукацыі сёння складае 1 711 700 рублёў, а ў метадыстаў — 1 732 600 рублёў.

**Да работы на педагагічных пасадах прыцягваюцца педагогі пенсійнага ўзросту. Яны складаюць каля 9% ад агульнай колькасці настаўнікаў, і гэты паказчык у апошнія гады расце.** Патрэба ў маладых спецыялістах ёсць, і сістэма педагагічнай адукацыі ў стане іх падрыхтаваць, але галіна пакуль не ў стане іх утрымаць.

## Паперы замест дзяцей?

Больш падрабязна пра кадравую сітуацыю ў сістэме дашкольнай адукацыі паведаміла **намеснік загадчыка дашкольнай установы адукацыі «Яслі-сад № 202» г.Мінска Кацярына КОМЛАЧ:**

— Фактычна колькасць выхавальнікаў, якія працуюць у нашым дзіцячым садку, сёння значна меншая за прадугледжаную штатным раскладам. Ёсць незапоўненыя пасады памочнікаў выхавальнікаў і кухараў. Здзіўляцца гэтаму не даводзіцца, паколькі зарплата выхавальніка — спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, з 15-гадовым стажам работы і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй — не перавышае 2 млн 250 тысяч рублёў (або 258 долараў). **Максімум, на які можа разлічваць памочнік выхавальніка, — 1 мільён 300 тысяч рублёў (153 долары), а кухар — на 1 млн 170 тысяч (137 долараў).** І ўсё гэта з улікам даплат, якія практыкуюцца ў сталіцы. Сёлета з мая штомесячная падтрымка работнікаў адукацыі складае ў Мінску 240 тысяч рублёў. І хоць памеры гэтых выплат невялікія, але яны дазваляюць павысіць узровень сярэднямесячнай заработнай платы работнікам сталічных устаноў адукацыі ў параўнанні з іх калегамі з іншых рэгіёнаў.

Сёння ў сталіцы працягваецца будаўніцтва новых устаноў дашкольнай адукацыі...

— Але як у новых садках можна вырашыць пытанне з кадрамі, калі спецыялістаў востра не хапае ва ўстановах, якія ўжо працуюць? — задала рытарычнае пытанне Кацярына Комлач. — Праблему не ўдаецца вырашыць не першы год і з дапамогай размеркавання ў дашкольныя ўстановы маладых спецыялістаў. Папрацаваўшы ў дзіцячым садку нават непрацяглы час, учарашнія студэнты хутка ўсведамляюць складанасць і напружанасць працы педагога, якому літаральна кожную секунду даводзіцца несці адказнасць за жыццё і здароўе дзяцей. Між іншым, заработная плата маладога спецыяліста з улікам устаноўленых даплат складае 2 млн 150 тысяч рублёў. Але ўжо праз два гады ўсе даплаты знімаюцца, і ў выніку застаецца заробак у 1 млн 850 тысяч рублёў. Таму маладыя кадры і не затрымліваюцца...

Не менш важная праблема — нізкі конкурс у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка на спецыяльнасць «Дашкольная адукацыя». Вельмі часта ў БДПУ маладыя людзі паступаюць зусім не таму, што жадаюць прысвяціць сваё жыццё гэтай прафесіі, а таму, што проста ёсць рэальная магчымасць паступіць і атрымаць вышэйшую адукацыю.

— Абсалютна відавочна, што без павышэння статусу работнікаў дашкольных устаноў нам не даводзіцца разлічваць на прыход якаснага абітурыента, — канстатавала Кацярына Комлач. — Зараз нагрузка на выхавальніка, які працуе на стаўку, складае 36 гадзін у тыдзень. Згодна з даследаваннямі, 80%, або асноўная яго частка, прыпадае на непасрэдныя зносіны з выхаванцамі і іх бацькамі. І хоць праблема зніжэння нагрузкі на выхавальнікаў да 30 гадзін узнімаецца на самых розных узроўнях на працягу больш як 10 гадоў, яна пакуль так і не вырашылася. Хацелася б сказаць і колькі слоў аб непамернай колькасці дакументацыі, запаўненне якой адцягвае ўвагу выхавальнікаў ад выканання непасрэдных службовых абавязкаў і, у першую чаргу, ад забеспячэння бяспекі дзяцей. Нягледзячы на тое, што ў інструктыўна-метадычных лістах Міністэрства адукацыі патрабуе мінімізаваць колькасць дакументацыі ў дашкольных установах, нам пастаянна даводзіцца пісаць шматлікія справаздачы, якія дублiруюць адна адну, заводзіць сшыткі, журналы ўліку і гэтак далей. Гэта значыць, што на самой справе дакументаабарот не змяншаецца, а павялічваецца.

> **«Праведзены прафсаюзам у кастрычніку 2011 года маніторынг паказаў, што ў галіне адукацыі працягваюць працаваць 68,5% маладых спецыялістаў, а астатнія, адпрацаваўшы ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін, звальняюцца і пераходзяць на работу ў арганізацыі іншых сфер эканомікі»**

## Амаладжваць кадры ці ўсё ж захоўваць «залаты фонд»?

А вось для вышэйшай школы злабадзённай праблемай стаў абвешчаны пераход на чатырохгадовы тэрмін падрыхтоўкі спецыялістаў.

— Пытанне вырашана ў прынцыпе, але механізмы яго рэалізацыі (а галоўнае, наступствы) для супрацоўнікаў незразумелыя. Відавочны той факт, што вызваленне педагагічных работнікаў усё ж такі адбудзецца, — падзялілася сваім бачаннем сітуацыі **старшыня прафкама супрацоўнікаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Ларыса ГІМПЕЛЬ.** — Можна меркаваць, што кожная ВНУ будзе імкнуцца захаваць сваіх самых вопытных спецыялістаў. Але ці не азначае гэта, што прыток маладых спецыялістаў на выкладчыцкую работу будзе на пэўны час спынены? І ўсё гэта адбываецца ў сітуацыі, калі трэба тэрмінова амалоджваць прафесарска-выкладчыцкі састаў ВНУ!

> **«Рэальная зарплата дацэнта, які працуе толькі на стаўку, супастаўная з сярэднямесячнай зарплатай школьнага настаўніка (3 198 000 рублёў) і не дацягвае да сярэднямесячнага заробку прафесарска-выкладчыцкага саставу зусім «дробязь»... — 1 мільён рублёў»**

У сваю чаргу, праблема амаладжэння заканамерна звязана з праблемай пенсійнага забеспячэння, а дакладней, з памерамі пенсій.

— Так, адпрацаваўшы ў ВНУ 33 гады, выкладчык, які не мае вучонай ступені, пры афармленні на пенсію ў кастрычніку 2011 года атрымаў пенсію ў памеры 1 200 758 рублёў. А ў маі 2012 года кандыдату педагагічных навук (дацэнту) была налічана пенсія 1 408 385 рублёў, — прывяла канкрэтныя прыклады Ларыса Гімпель. — **Скажыце, як можна пражыць у Мінску за гэтыя грошы? Асабліва адзінокім людзям? Вось і працуюць у ВНУ выкладчыкі і ў 70 гадоў, і ў больш сталым узросце, бо іншага выйсця ў іх няма.**

Цяпер аб статыстычным падыходзе да вызначэння нашай з вамі сярэдняй заработнай платы. На наш погляд, наспела неабходнасць вызначаць сярэдні заробак у галіне без уліку сумяшчальніцтва і падпрацовак. Скажам, заробак прараба на будоўлі, майстра цэха, эканаміста ў банку ўключае ў сабе службовы аклад + прэмію + надбаўкі. А ў сістэме адукацыі, каб дацягнуцца да афіцыйна агучаных лічбаў заробкаў і жыць больш-менш годна, педагогі вымушаны браць стаўку + палову стаўкі + дадатковую працу з аплатай за кожную гадзіну, у сукупнасці з прэміяй і надбаўкамі.

На ўласным прыкладзе магу сказаць, што рэальная зарплата дацэнта, які працуе толькі на стаўку, супастаўная з сярэднямесячнай зарплатай школьнага настаўніка (3 198 000 рублёў) і не дацягвае да сярэднямесячнага заробку прафесарска-выкладчыцкага саставу зусім «дробязь»... — 1 мільён рублёў. **На самой справе мы працуем, наносячы шкоду і ўласнаму здароўю, і якасці адукацыі. І яшчэ: кажучы аб нашых з вамі заробках, я лічу некарэктным параўноўваць іх з заробкамі ў прамысловасці. А чаму б не параўноўваць іх з сярэднямесячнай зарплатай увогуле па краіне?**

Яшчэ адна нявырашаная праблема — працягласць адпачынкаў у педагагічных работнікаў сістэмы павышэння кваліфікацыі. Склалася парадаксальная сітуацыя: працуючы на любой універсітэцкай кафедры, выкладчыкі маюць 48 рабочых дзён адпачынку, а на кафедры паслядыпломнай адукацыі (павышэння кваліфікацыі) — усяго 24 рабочыя дні.

— Пры такім падыходзе складана замацаваць на кафедрах павышэння кваліфікацыі высакакласных спецыялістаў, хоць менавіта такія спецыялісты і павінны там выкладаць, — лічыць Ларыса Гімпель.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СЛЕДЧЫ КАМІТЭТ ПАСПЯХОВА ВЫКАРЫСТОЎВАЕ ВОПЫТ МУС І ПРАКУРАТУРЫ Ў РАСКРЫЦЦІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ


Фота БЕЛТА.

**Аб гэтым паведаміў учора журналістам у час рабочай паездкі ў Пінск старшыня Следчага камітэта Беларусі Валерый Вакульчык, перадае БЕЛТА.**

«У Следчы камітэт прыходзяць вопытныя супрацоўнікі з пракуратуры, з міліцыі, яны працуюць разам, і, такім чынам, кампетэнцыя кожнага следчага Следчага камітэта значна ўзрастае», — адзначыў старшыня. Ён падкрэсліў, што такая практыка пазітыўна адбіваецца на рабоце ўсяго ведамства.

Валерый Вакульчык наведаў у Пінску раённы аддзел Следчага камітэта, дзе заслухаў даклады аб стане спраў у раёне. «Крыміналагенная сітуацыя на Піншчыне, як і ва ўсёй рэспубліцы, мае ўстойлівую тэндэнцыю да зніжэння», — падкрэсліў старшыня. Паводле яго слоў, у працэнтных суадносінах Пінскі раён і раней быў больш спакойны, чым многія іншыя рэгіёны. «Сёння на Піншчыне няма гучных крымінальных спраў, у асноўным мы маем справу з бытавымі злачынствамі і дробнымі крадзяжамі», — расказаў ён.

Таксама старшыня наведаў будынак, адведзены раённаму Следчаму камітэту па вуліцы Суворава, 1. Паводле яго слоў, у ім яшчэ трэба правесці пэўныя рамонтныя работы, але ў цэлым умовы дзейнасці пінскіх следчых будуць на даволі высокім узроўні. Акрамя таго, Валерый Вакульчык правёў двухгадзінную тэлефонную гарачую лінію ў мясцовым выканкаме, у ходзе якой адказаў на актуальныя пытанні грамадзян.

# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПЛАНУЕЦЦА ЎДАСКАНАЛІЦЬ У БЕЛАРУСІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У законапраекце вызначаны асноўныя прынцыпы, мэты і задачы выдавецкай справы, парадак выпуску сацыяльна значных выданняў. Упершыню на ўзроўні заканадаўчага акта замацоўваецца шэраг паняццяў, якія датычацца выдавецкай справы. Вызначаюцца таксама суб'екты, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў сферы выдавецкай справы. Законапраект размяжоўвае іх паўнамоцтвы, а таксама вызначае дзяржаўную палітыку ў гэтай сферы. «Дзяржаўная палітыка ў сферы выдавецкай справы абсалютна гуманная, зразумелая і празрыстая», — падкрэсліў міністр. Прапісаны таксама правы і абавязкі выдаўцоў, вытворцаў, распаўсюджвальнікаў і заказчыкаў. Акрамя таго, законапраект апісвае парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і перарэгістрацыі выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў. Вызначаецца пералік катэгорый суб'ектаў гаспадарання, якія не падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі. Сказана ў законапраекце і аб мерах адказнасці за парушэнні ў сферы выдавецкай дзейнасці.

Мяркуецца, што закон уступіць у сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання, паведаміў міністр інфармацыі. Рэалізацыя палажэнняў закона «Аб выдавецкай справе ў Беларусі» дасць магчымасць удасканаліць прававое рэгуляванне ў выдавецкай дзейнасці, будзе садзейнічаць павышэнню долі высакаякаснай, канкурэнтаздольнай прадукцыі на знешнім і ўнутраным рынку, упэўнены Алег Праляскоўскі.

«З уступленнем у сілу гэтага закона існуючы механізм ліцэнзавання выдавецка-паліграфічнай дзейнасці будзе заменены на больш дэмакратычны механізм дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў друкаванай прадукцыі з вядзеннем адзінага рэестра. Рэгістрацыя будзе мець бестэрміновы характар і не будзе патрабаваць прадаўжэння праз пэўны прамежак часу», — адзначыў міністр інфармацыі.

«Такім чынам, прыняцце закона аб выдавецкай справе дасць магчымасць ажыццяўляць комплекснае дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне друку, забяспечваць дзяржаўныя прыярытэты ў развіцці сферы, прымяняючы пры гэтым сучасныя формы рэгулявання, якія адпавядаюць міжнародным стандартам. Дасць магчымасць рэгуляваць прававыя адносіны паміж суб'ектамі выдавецка-паліграфічнай сферы, распаўсюджвальнікамі друкаванай прадукцыі, дзяржаўнымі, грамадскімі арганізацыямі, грамадзянамі, забяспечыць спрыяльныя ўмовы для развіцця гэтай сферы і яе прафесійных удзельнікаў», — рэзюмаваў Алег Праляскоўскі.

Дэпутаты задалі міністру інфармацыі пытанні наконт змяненняў, якія нясе ў сабе законапраект. У прыватнасці, парламентарыі пыталіся аб тым, якімі крытэрыямі кіруецца Міністэрства інфармацыі пры вызначэнні сацыяльна значных выданняў, а таксама пытанні, што датычацца асаблівасцей рэгламентацыі выдавецкай дзейнасці. Дэпутаты пазітыўна ацанілі падрыхтоўку названага законапраекта і выказаліся на карысць прыняцця такога дакумента ў Беларусі.

## АБЗАЦ

◢ У Гродзенскай вобласці ў студзені — маі гэтага года выдадзена субсідый для адкрыцця свайго бізнэсу беспрацоўным на суму каля Br1,8 млрд. Субсідыі атрымалі 203 чалавекі. У тым ліку сродкі выдадзены на адкрыццё прыватнага ўнітарнага прадпрыемства, сялянска-фермерскай гаспадаркі, на арганізацыю дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, для арганізацыі рамеснай дзейнасці і інш.

◢ **25 чэрвеня ў Асіповіцкі аддзел транспартнай міліцыі па тэлефоне ад дзяжурнай па станцыі паступіла інфармацыя аб тым, што ў 23.37 паблізу вёскі Татарка Асіповіцкага раёна цягніком траўмаваны мужчына. Гэтыя звесткі па радыёсувязі перадаў машыніст грузавога цягніка Асіповічы—Калінкавічы. Выконваючы чарговы рэйс, лакаматыўная брыгада заўважыла чалавека, які ляжаў на суседнім чыгуначным пуці. З цяжкімі траўмамі пацярпелага даставілі ў бальніцу, дзе ён неўзабаве памёр. Па словах відавочцаў, да трагедыі мужчына ў лесе збіраў грыбы. Затым яго бачылі на тэрыторыі станцыі ў стане алкагольнага ап'янення. Вядзецца праверка, высвятляюцца абставіны трагедыі. Загінулы — 34-гадовы непрацуючы жыхар Бабруйска.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У Аргенціне стварылі піўны аўтамат, з якога трэба выбіваць піва. Адна з піўных кампаній, якая славіцца сваёй любоўю да рэгбі, вынайшла незвычайны аўтамат, куды трэба не толькі засунуць манетку, але і з усяе сілы, «па-рэгбійнаму», добра пхнуць прыстасаванне. Аўтамат атрымаў назву «Rugbeer». Па звестках кампаніі, такое вынаходніцтва садзейнічала таму, што ўжо ў першыя дні продаж піва праз такія аўтаматы павялічыўся на 25%. Да ўсяго варта дадаць, што ў Аргенціне рэгбі ў балельшчыкаў па папулярнасці канкурыруе з футболам.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Міхаіл БАТУРА:

# «БЕЛАЯ РУСЬ» СЁННЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА РЭАЛЬНАЙ СІЛАЙ ГРАМАДСТВА»

Самая буйная арганізацыя РГА «Белая Русь» падвяла вынікі працы за 5 гадоў

**МІНСКАЯ гарадская арганізацыя «Белай Русі», створаная ў снежні 2007 года, налічвае больш за 29 тысяч членаў (сёння ў аб'яднанні больш за 129 тысяч членаў), каля 1200 «пярвічак» і 4 арганізацыі па вытворчым прынцыпе.**

— Пяць гадоў таму мы вырашылі, што менавіта зараз Беларусі патрэбна моцная, сучасная грамадская арганізацыя, якая аб'яднае ў свае шэрагі пазітыўныя сілы нашай краіны, якія здольныя праявіць сябе і паказаць прыклад грамадзянскай еднасці ў імя моцнай і квітнеючай Беларусі, — коратка нагадаў гісторыю **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі, рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА**. — Мы бачылі сваю задачу ў тым, каб быць сувязным звяном паміж уладай і працоўнымі калектывамі. Мы не фарсіравалі падзеі, тым не менш нам удалося наладзіць актыўнае супрацоўніцтва з гарадскімі ўладамі, разбурыць стэрэатып пра непрыняцце любой грамадскай арганізацыі, у станоўчым сэнсе гэтага слова заявіць пра сябе.

Многія сацыяльныя мерапрыемствы Мінскай гарадской арганізацыі «Белай Русі» палюбіліся як самім членам арганізацыі, так і жыхарам сталіцы. Сярод іх асабліва вылучаецца дапамога ў арганізацыі святкавання Дня Незалежнасці і Дня Перамогі, калі «беларосы» не толькі віншуюць жыхароў і гасцей Мінска, упрыгожваюць гарадскі транспарт, бяруць удзел у парадах, выкананні Дзяржаўнага гімна, ускладанні вянкоў, але і клапоцяцца пра ветэранаў — у выпадку дрэннага надвор'я ўручаюць ім парасоны і плашчы, якія потым застаюцца добрым напамінам пра свята.

Яшчэ адна кранальная акцыя — уручэнне падарункаў для нованароджаных 3 ліпеня. «Многія маці настолькі ўражаныя, што абяцаюць праз год пастарацца нарадзіць у гэты дзень яшчэ адно дзіця», — не без усмешкі заўважыў старшыня арганізацыі.

Аднак Мінская арганізацыя «Белай Русі» не абмяжоўваецца толькі сацыяльнымі і культурнымі праектамі. Яна расце і як грамадска-палітычная сіла. Пра гэта сведчыць і функцыянаванне 13 грамадскіх прыёмных, куды можа звярнуцца любы грамадзянін са сваёй праблемай, пытаннем або прапановай. Падчас выбарчых кампаній такія прыёмныя становяцца паўнавартаснымі «перадвыбарнымі штабамі»: тут праводзіцца вучоба і метадычныя заняткі з актывам, рыхтуюцца ініцыятыўныя групы, давераныя асобы, члены ўчастковых выбарчых камісій, агітацыйных груп і назіральнікі.

— У папярэдніх парламенцкіх выбарах у рознай якасці бралі ўдзел больш за 4 тысячы нашых членаў, — адзначыў Міхаіл Батура. — У некаторых акруговых камісіях «беларосы» склалі да 86%.

Сёлетнія парламенцкія выбары стануць іспытам на трываласць аб'яднання, лічыць старшыня Мінскай гарадской арганізацыі. «Сітуацыя будзе няпростай, нам трэба будзе адстойваць свае пазіцыі. Нельга баяцца падтрымаць сваіх калег», — сказаў ён.

Сярод перспектыў развіцця арганізацыі Міхаіл Батура назваў пераўтварэнне «Белай Русі» ў партыю і прыкметнае прадстаўленне арганізацыі ў парламенце. «Ініцыятывы пра пераход у партыю зыходзяць знізу ўжо года паўтара. Але трэба ўсё дасканала ўзважыць: тут паспешлівасць можа нашкодзіць, — пракаментаваў ён гэты момант журналістам. — Разам з тым, мы маем ужо немалыя вопыт і аўтарытэт, этап станаўлення скончаны, і «Белая Русь» стала рэальнай сілай грамадства».

Перспектывы пераходу аб'яднання да партыі будуць разгледжаны на лістападаўскім з'ездзе РГА «Белая Русь», як паведаміў раней старшыня аб'яднання Аляксандр Радзькоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## У БАЛЬНІЦУ СА СВАІМІ «ЛЕКАМІ»

З дыягназам «двухбаковая лёгачная пнеўманія» ў рэанімацыйнае аддзяленне Гомельскай абласной туберкулёзнай бальніцы трапіла непрацуючая, раней судзімая жыхарка Гомеля. Медыкі, калі пераапраналі 32-гадовую жанчыну, у ніжняй бялізне знайшлі 34 таблеткі. Паводле заключэння эксперта, прэпараты агульнай масай 4,3 грама ўтрымліваюць небяспечнае псіхатропнае рэчыва — трамадол. Заведзена крымінальная справа па артыкуле аб незаконным абарачэнні наркатычных сродкаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## МІЛІЦЫЯНЕРЫ ВЫРАТАВАЛІ З РАКІ МАЦІ З ДЗІЦЕМ

Лодка, у якой па Свіслачы плавала сям'я з маленькім дзіцем, перакулілася. Людзі, што апынуліся ў вадзе, безвынікова спрабавалі выбрацца на бераг...

— У гэты час супрацоўнікі Партызанскага РУУС сталіцы неслі службу ў Цэнтральным парку імя Горкага. Праходзячы на набярэжнай уздоўж ракі, старшы інспектар групы кадраў лейтэнант міліцыі Аляксей Петушкоў і ўчастковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх капітан міліцыі Андрэй Леановіч пачулі крыкі, што даносіліся з боку моста побач з дамбай, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Андрэй Леановіч адразу ж кінуўся ў ваду і дастаў 5-гадовага хлопчыка, якога перадаў калегу. Галава сям'і выбраўся сам, а яго напужанай жонцы спатрэбілася дапамога міліцыянераў. Яны ж потым праводзілі сям'ю, якая была ў шокавым стане, дадому. Ужо пасля здарэння пацярпелыя адшукалі сваіх выратавальнікаў і падзякавалі ім, папрасіўшы кіраўніцтва РУУС адзначыць смелыя дзеянні супрацоўнікаў.

## ПАЛЕЗ, КАБ ДАСТАЦЬ ПОМПУ, І ПАТАНУЎ У КАЛОДЗЕЖЫ

Мужчына патануў у калодзежы, калі спрабаваў дастаць помпу, што зламалася. Выклік на такое здарэнне ў вёску Галоўчын Бялыніцкага раёна паступіў у службу МНС пасля чатырох гадзін дня. Тэлефанавала жыхарка вёскі.

— У калодзежы была знойдзена паламаная пагружная помпа «Ручаёк» і кавалак вяроўкі. Мяркуецца, што пры спробе дастаць з калодзежа помпу вяроўка, па якой мужчына, пенсіянер 1952 года нараджэння, спускаўся ўніз, абарвалася, і той упаў у ваду. Глыбіня пітнога калодзежа была 12 метраў, дыяметр — метр, — распавялі ў цэнтры прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Выратавальнікам засталося толькі дастаць загінулага са дна: брыгада хуткай медыцынскай дапамогі канстатавала смерць...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «НЕХТА СПЫТАЕ: ХТО Ў ГЭТАЙ МАГІЛЕ? А НАДПІС ПАКАЖА: ЯНКА КУПАЛА»

***70 гадоў назад, 28 чэрвеня 1942 года, у гасцініцы «Масква» трагічна абарвалася жыццё народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. За некалькі дзён да 60-гадовага юбілею...***



Прайшло столькі часу, але і дагэтуль смерць паэта ўсё яшчэ застаецца загадкай. Што гэта было: няшчасны выпадак, самагубства, забойства?

...Янку Купалу пахавалі ў Маскве. У 1962 годзе, да 80-годдзя паэта, урну з яго прахам перавезлі ў Мінск, пахавалі на Вайсковых могілках (вул. Казлова).

Штогод 28 чэрвеня, у дзень смерці Янкі Купалы, традыцыйна праходзяць жальбіны. У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы нам паведамілі, што **сёння, у 16.30, на Вайсковых могілках збяруцца разам прыхільнікі творчасці Песняра,** каб прыняць удзел у вечары памяці «Жальбіны».

А на наступным тыдні, з нагоды 130-годдзя Янкі Купалы, пройдзе шэраг мерапрыемстваў. 6 ліпеня ў 11.00 адбудзецца ўрачыстае ўскладанне кветак да помніка Янку Купалу ў Мінску. 7 ліпеня ў 10.00 — адкрыццё новай экспазіцыі ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, а ў 13.00 пачнецца свята паэзіі ў Вязынцы.

**Ігар ШЛАПАК.**

**Янка КУПАЛА**

### І ПРЫЙДЗЕ

*І прыйдзе новых пакаленняў*
*На наша месца грамада*
*Судзіці суд, ці мы сумленна*
*Жыццё прайшлі, ці чарада*

*Зняваг мінулых нас не з'ела,*
*Пакінуўшы свой дым і чад,*
*І мы па-даўняму нясмела*
*Жылі не ўлад і неўпапад?*

*Ці аб свой гонар дбайна дбалі,*
*І дабравольна, без прынук,*
*Самі сабой не гандлявалі,*
*Не неслі ў петлі дум і рук?*

*І ці пакінуці на памяць*
*Мы песень гэтакіх змаглі,*
*З якіх бы можна было ўцяміць,*
*Што мы свабоднымі былі?..*

*А ўжо свой выдасць непадкупны*
*Аб нас гісторыя прысуд,*
*Калі аглядам гляне рупным*
*І разбярэ, ў чым справа тут.*

*У сведкі запісы пакліча,*
*Паданні клікне ў час такі*
*І ўсё паліча, пераліча...*
*А суд гісторыі цяжкі!..*

*І засумуецца патомак,*
*Калі дазнаецца аб нас,*
*Што нейкі з нас хоць быў не зломак,*
*А плечы гнуў у крук не раз;*

*Не йшоў з адкрытымі вачыма*
*У свет і сцежкі не прастаў,*
*А ўсёй магчымасці магчымай*
*Таптаў сляды, сябе таптаў.*

**1926**

## ЯНКА КУПАЛА. СУПРАЦЬСТАЯННЕ ПАЭТА

**130-годдзе Янкі Купалы — цудоўная нагода кожнаму расказаць сваю гісторыю пра песняра. РУП « Беларускі відэацэнтр» зняў стужку «Янка Купала... Я адплацiў народу...», у якой распавядаецца гісторыя няпростага жыцця паэта, пачынаючы ад нараджэння ў вёсцы Вязынка, заканчваючы таямнічай смерцю ў Маскве 28 чэрвеня 1942 года.**

У газеты «Звязда» з Янкам Купалам свае стасункі. Асаблівыя. Будучы некалі афіцыйным друкаваным органам ЦК партыі, «Звязда» не магла не друкаваць усё, што было патрэбна. А таму, напрыклад, у маі 1930 года выйшаў артыкул, у якім Купалу назвалі «ідэолагам буржуазнага нацыянал-адраджанізму», а пазней — і наогул пакаянны ўра-камуністычны ліст пісьменніка, які, мяркуецца, быў напісаны пад дыктоўку. І, вядома, усё гэта не магло не паўплываць на лёс, імя і рэпутацыю Янкі Купалы...

Чамусьці менавіта гэтыя, у прынцыпе, ужо даволі даўно вядомыя факты, агучаныя ў дакументальным фільме рэжысёра і сцэнарыста Сяргея Лук'янчыкава, закранулі асабіста мяне найбольш. Цікава, што ў гэтай газетнай гісторыі як мінімум тры ахвяры сталінізму: Янка Купала, які заўчасна загінуў; газета «Звязда», якую бязлітасна выкарыстоўвалі, і беларускі народ, якога не менш бязлітасна падманвалі... Вядома, не гэта асноўны лейтматыў дакументальнай стужкі, але матыў супрацьстаяння Асобы і Сістэмы — вельмі выразны. Маральная ды фізічная несвабода беларусаў — гэта якраз тое, з чым Янка Купала змагаўся ўсё жыццё. І ў стужцы «Янка Купала... Я адплаціў народу...» прыводзяцца канкрэтныя факты гэтага жудаснага супрацьстаяння.

А як мог супрацьстаяць Сістэме Паэт? Ён не ваеннакамандуючы, які можа павесці за сабой шматмільённую армію, ён не забойца, не кат і не суддзя. Ён — Паэт. Ён можа пісаць свае вершы для людзей, выказваць ім свае думкі, сваю праўду. Але за сваю творчасць і смеласць ён атрымае шмат болю і гора. Такі лёс Паэта, Прарока беларускай нацыі.

У стужцы шмат лірыкі, якая выглядае не пафасна і не банальна. Па-першае, вельмі парадавалі песні, якія гучаць у фільме. Сучасныя, з добрымі аранжыроўкамі і вакалам, пранікнёныя. Песні на невыпадковыя словы. Па-другое, лірыкі надае і сугучнасць кампазіцыі фільма музычнаму спектаклю Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Янка Купала. Кругі раю» (аўт. і рэж. Святлана Навуменка, кампазітар Віталь Сундзін), урыўкі з якога мы бачым і песні якога мы чуем. Тэатралізаваныя сцэны глядзяцца арганічна, злучаюць дакументальныя фота і кадры старой кінахронікі з сучаснасцю. Вядучыя Аляксандр Марчанка і Вераніка Буслаева распавядаюць гісторыю нараджэння, жыцця, змагання і смерці Янкі Купалы, пералічваючы асноўныя факты біяграфіі паэта. А ў спектаклі мы бачым, як маці гайдае немаўля, спяваючы яму песні на беларускай мове, як Купала пераконвае мужыкоў у тым, што хопіць цярпець прыгнёт панскі... Тут і народныя строі, і купальскія вянкі, і выдатны малады акцёр Дзяніс Паршын, які са шчырым запалам выконвае ролю Янкі Купалы.

Напэўна, тое, што рэжысёр стужкі Сяргей Лук'янчыкаў вырашыў уключыць у фільм урыўкі з тэатральнай пастаноўкі, невыпадковае яшчэ і таму, што Янка Купала сам меў непасрэднае дачыненне да тэатра, яго сцэнічныя творы былі неверагодна папулярныя і актуальныя як тады, так і цяпер. І вось перад намі архіўныя кадры са спектакля «Паўлінка» (рэж. Леў Літвінаў), а вось — кадры з мастацкай стужкі «Раскіданае гняздо» (рэж. Барыс Луцэнка) паводле культавай п'есы Янкі Купалы 1913 года. У яе аснову пакладзены факты з жыцця дзеда Ануфрыя, у якога пан адабраў зямлю і хату. Янка Купала асэнсаваў сямейную трагедыю як агульнанародную...

Усё гэта было даўно. Але Янка Купала назаўжды з намі. Ён як народны заступнік, як напалову казачны ўсёмагутны герой, які заўжды зразумее, абароніць і падтрымае. Мы можам паплакацца нашаму Янку Купалу пра свой гаротны лёс, пра тое, як нас ніхто не разумее, пра сваю бездапаможнасць. І аднекуль адтуль, з нябесных сфер ён спагадліва паглядзіць на нас і скажа нешта накшталт: «І прыйдзе новых пакаленняў на наша месца грамада...»

Дакументальны фільм заканчваецца апладысментамі стваральнікам спектакля «Янка Купала. Кругі раю». Камера асцярожна паказвае гледачоў у зале. Яны ў захапленні. Іх — поўная зала. Яны розныя. Можа быць, яны і ёсць тое самае новае пакаленне?.. Так мастацтва кіно стварае свае паралелі паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**


Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.07.2012 г. будуць разыграны 7 прасаў, 7 чайнікаў, 7 кухонных машын, 1 пыласос для Мінскай вобласці і суперпрыз — печ ЗВЧ. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 21.07.2012 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2012 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 5.05.12 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 5.05.12 па 30.09.12.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2008 ад 20.04.12, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.




## Які тэлефон службы выратавання?

■ Летні рэпартаж

**Зразумела, «101». А вось начальніца аднаго з летнікаў на Віцебшчыне — а яна, як вядома, асабіста адказвае за бяспеку дзяцей, якія адпачываюць у аздараўленчым лагеры — толькі з трэцяй спробы ўспомніла дакладны нумар тэлефона пажарных. Да гэтага называла: «01», «001»... Зусім не весела, калі, не дай Бог, нешта незвычайнае ў лагеры адбылося б. Карэспандэнт «Звязды» пабываў у некалькіх загарадных летніках. Браў удзел у рэйдзе разам з прадстаўнікамі зацікаўленых ведамстваў, якія кантралююць падрыхтоўку лагераў да прыёму дзяцей. Ініцыятарам правядзення рэйду стала Віцебскае абласное ўпраўленне па надзвычайных сітуацыях.**

Першым мы наведалі летнік ААТ «КІМ», які знаходзіцца ў Сенненскім раёне. На момант нашага прыезду не было пяску ў спецыяльнай пажарнай скрынцы, пажарных шчытоў.

— Пясок сёння будзе... Змена ж пачалася толькі 19 чэрвеня і прадоўжыцца 18 дзён, — расказвае Уладзімір Бурмак, начальнік лагера «Чайка».

Дарэчы, сёлета кошт пуцёўкі большы за 1,2 мільёна рублёў. Што датычыцца заробку работнікаў, пакуль сказаць цяжка, якім ён будзе. Але пачуў, што «за такія капейкі» вельмі цяжка было знайсці ахвотных папрацаваць.

Дарэчы, ужо легендай стаў кур'ёз у іншым летніку, які адкрылі пры санаторыі, дзе па выніках змены работнікі... абавязаны былі яшчэ і даплаціць за знаходжанне ў лагеры, бо іх кармілі нароўні з дзятвой. У выніку зарабілі менш, чым каштавала харчаванне.

Пацікавіўся заробкам у маладой выхавальніцы, Алесі Карабіцкай, студэнткі трэцяга курса факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі ВДУ імя П.М. Машэрава. Дзяўчына сціпла прызналася, што не ведае, колькі атрымае: працаваць у летніку яна пагадзілася не за грошы, а таму, што падабаецца. Расказала, што вельмі любіць дзяцей. А для студэнта нават малыя грошы — не лішнія.

Разам з Людмілай Фёдараўнай Малікавай, загадчыцай аддзела гігіены дзяцей і падлеткаў Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, зайшлі ў сталовую.

— Харчаванне ў летніках павінна быць арганізавана 4-5 разоў праз 3-4 гадзіны. Фактаў харчовых атручванняў, успышак вострых кішэчных інфекцый у аздараўленчых летніках не зарэгістравана на працягу апошніх пяці гадоў, — каментуе яна. — Асаблівых прэтэнзій да якасці харчавання таксама не было. Стравы павінны адпавядаць патрабаванням па колькасці калорый і быць збалансаванымі. Каб высветліць, ці так гэта насамрэч, трэба правесці больш пільнае вывучэнне. Кожны тыдзень наша служба праводзіць маніторынг. Арганізавана штодзённая тэлефонная сувязь з кіраўнікамі летнікаў. Пры наведванні лагераў складваюцца пратаколы агляду выяўленых парушэнняў...

Пасля азнаямлення з работай харчовага блока летніка «Чайка» выявіліся парушэнні: для прыгатавання страў дзіцячага харчавання тут выкарыстоўваюць сталовыя яйкі, а патрэбны дыетычныя. Посуд таксама трэба замяніць, бо ён не адпавядае патрабаванням.

У летніку «Лясная паляна», які належыць арганізацыі «Віцебскаблаўтатранс», адпачываюць каля 120 дзяцей. Тут чамусьці «закрылі вочы» на неабходнасць выканання патрабаванняў пажарнай бяспекі. Вогнетушыцелі, паводле слоў начальніка летніка, ёсць, але знаходзяцца яны «ў іншым месцы». Нават «прымітыўных» — старога ўзору — апавяшчальнікаў няма там, дзе праводзяцца мерапрыемствы для дзятвы. Супрацоўнік аддзела МНС Віцебскага раёна ледзь паспяваў запісваць усе ўбачаныя недахопы. У адказ на канкрэтнае пытанне: чаму не зрабілі ўсё неабходнае — у адказ пачулі, што прад'яўляць прэтэнзіі трэба арганізацыі, якой належыць летнік.

Летнік ААТ «Віцязь» — будучы «Артэк» — яшчэ толькі рыхтаваўся да прыёму дзятвы і падлеткаў. Адразу кінулася ў вочы, як старанна фарбуе рабочы вялікі... бюст Леніна(!). І тут, і там нешта рамантавалі, наводзілі парадак.

Летнік «Энергетык» «Віцебскэнерга» па праве можна назваць самым лепшым у вобласці. «Энергетык» больш нагадвае пансіянат еўрапейскага ўзроўню. У прыватнасці, сталовая хутчэй нагадвае рэстаран, дзе вельмі ўтульна. Старшы выхавацель Ірына Краўчанка расказала, што на харчаванне кожнага дзіцяці траціцца ад 28 да 32 тысяч рублёў штодня (у залежнасці ад катэгорыі харчавання).

Пасля рэйду пацікавіўся станам летнікаў у цэлым па Віцебскай вобласці ў начальніка прадстаўніцтва Віцебскага абласнога ўпраўлення рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Алены Андрайковай.

***— Ці зменшылася сёлета колькасць летнікаў?***

— Іх меней не стала. Колькасць загарадных летнікаў — 35. Акрамя гэтага, кругласутачныя летнікі штогод адчыняюцца пры вучэбных установах, на базах адпачынку — і такіх больш за 10. Яны працуюць у раёнах, дзе фактычна няма ўласных «традыцыйных» летнікаў. У прыватнасці, у Глыбоцкім, Лепельскім, Шумілінскім, Пастаўскім і іншых. Штогод за лета ў аздараўленчых летніках адпачываюць каля 24 тысяч дзяцей і падлеткаў. Яшчэ прыкладна 31 тысяча чалавек — у прышкольных лагерах. Пакуль што не пачаў работу праваслаўны летнік «Дружба», разлічаны на аднаасовае пражыванне 140 дзяцей: там не былі выкананы прадпісанні санітарнай службы. Сёлета гэтаму летніку было выдзелена 300 мільёнаў рублёў са сродкаў рэспубліканскага суботніку на выраб праектнай-каштарыснай дакументацыі для рэканструкцыі сталовай і яшчэ 25 мільёнаў рублёў — са сродкаў дзяржаўнага страхавання.

***— Колькі грошай Віцебшчына ўклала ў падрыхтоўку летнікаў да адкрыцця, у развіццё іх інфраструктуры? Якія праблемы падрыхтоўчага перыяду можна назваць тыповымі?***

— Больш за 1,7 мільярда рублёў былі размеркаваны паміж летнікамі. Астатнія сродкі, заробленыя падчас суботніка — прыкладна 800 мільёнаў рублёў — пойдуць на адкрыццё летніка пад рабочай назвай «Віцебскі «Артэк», які створаць на базе цяперашняга летніка прадпрыемства «Віцязь».

Тыповая праблема — летнікі працуюць толькі тры месяцы, у халады яны не ацяпляюцца. У выніку назапашваецца вільготны кандэнсат. Таму падчас падрыхтоўкі да сезона адпачынку даводзіцца траціць шмат часу і сіл, каб прывесці карпусы ў належны стан.

***— Наколькі даступныя пуцёўкі ў летнікі?***

— Сярэдні кошт пуцёўкі ў летнік сёлета складае 1,4 мільёна рублёў. З іх 605 тысяч рублёў — датацыя са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Яна прадугледжана не толькі для членаў прафсаюза, як чамусьці ўпэўнены многія бацькі, а для ўсіх бацькоў, і беспрацоўных таксама — толькі пры ўмове, што апошнія стаяць на ўліку ў службе занятасці насельніцтва. Дзеці-сіроты, а таксама з няпоўных і шматдзетных сем'яў, тыя, хто адпачываюць у спартыўных летніках, і некаторыя іншыя могуць разлічваць на выплату вышэй названай «датацыі» дзяржавы на дзве змены.

Прадпрыемства або арганізацыя — уладальнік лагера — для сваіх работнікаў можа па-рознаму аплачваць частку кошту пуцёўкі, але ў любым выпадку бацькі заплацяць не менш за 10 працэнтаў ад яе рэальнага кошту...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**
*Сенненскі, Віцебскі раёны*

■ Далёкае — блізкае

## «НІКОЛІ НЕ ГАСНЕ НАДЗЕЯ»...



**Гэтыя словы (на рускай, беларускай, польскай, англійскай мовах і на іўрыце) пазначаны на сцяне музейнага пакоя, які нядаўна адкрыўся ў будынку гродзенскай сінагогі па Вялікай Траецкай вуліцы. Яны — з кнігі ўраджэнца горада над Нёманам, вядомага вучонага і бізнэсмена Фелікса Зандмана.**

Адна са старэйшых у Еўропе харальных сінагог была пабудавана ў 1578 годзе. Яна двойчы практычна цалкам знішчалася агнём, але адраджалася. Падчас фашысцкай акупацыі горада над Нёманам сінагога выкарыстоўвалася як месца збору вязняў гета перад расстрэлам ці адпраўкай у канцлагер. А пасля вайны, да перадачы храма яўрэйскай абшчыне, там размяшчаліся склады, майстэрні. Цяпер, дзякуючы шэрагу гродзенскіх прадпрымальнікаў, будынак паступова прыводзіцца ў парадак, а паралельна ўжо ідзе работа па стварэнні музейнай экспазіцыі яўрэйскай гісторыі і культуры Гродзеншчыны.





— Мэта новага музея, які з'явіўся ў нашым шматнацыянальным горадзе — расказаць пра гісторыю з'яўлення яўрэяў у Прынёманскім краі, яўрэйскую абшчыну, пра культурныя каштоўнасці гэтага народа, пра нашых вядомых землякоў, вязняў гродзенскага гета, выратавальнікаў яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны, — расказвае адзін з арганізатараў музея Беніямін Ерузалім.

Дарэчы, сталыя чытачы «Звязды» ўжо ведаюць Беніяміна Ефраімавіча па яго артыкуле ў нашай газеце «Цёця Надзя, татачка і Боба! Мае дарагія...» (7 верасня 2010 г.) пра гродзенскую сям'ю Наўмюкоў, якая выратавала ад халакосту яўрэйскага хлопчыка Іону Зарэцкага — потым вядомага журналіста, кінарэжысёра, дзеяча культуры. Імёны Надзеі, Аляксандра і Пятра Наўмюкоў пазначаны на сцяне ізраільскага нацыянальнага мемарыяла (Яд ва-Шэм) у памяць аб яўрэях, што загінулі ў гады Другой сусветнай вайны.

— І гэта не адзіны прыклад талерантнасці і самаахвярнасці, праведнасці на беларускай зямлі, — зазначае Беніямін Ерузалім. — У Гродне жыве цудоўная жанчына Ганна Сідаровіч, якая разам з бацькамі ў гады вайны выратавала яўрэйскую дзяўчынку. А адкрыццё музейнай экспазіцыі мы прымеркавалі да гадавіны смерці нашага славутага земляка Фелікса Зандмана. 14-гадоваму хлопчыку ўдалося ўцячы з гродзенскага гета, і жанчына з вёскі Ласосна Ганна Пухальская, рызыкуючы жыццём усёй сваёй вялікай сям'і, выратавала яго і яшчэ чатырох яўрэяў, паўтара года хаваючы іх у падвале дома. Потым Фелікс закончыў універсітэт у г. Нансі са званнем «Студэнт стагоддзя» і стаў не толькі выдатным вучоным, але і паспяховым бізнэсменам, стварыўшы буйны міжнародны канцэрн Vichay па вырабе электронных кампанентаў. Яго жонка Рут нядаўна прыслала з Амерыкі ліст з удзячнасцю гродзенцам.

Музейная экспазіцыя толькі пачынае стварацца. Людзі і іх лёсы, трагедыя і надзея... Ураджэнец Гродна мастак Леон Бакст. Вязень гродзенскага гета, а затым баец партызанскага атрада настаўнік Рыгор Хасід. Аўтар дзясяткаў навуковых прац прафесар Анатоль Ванукевіч, які пасля гета і канцлагераў у 15-гадовым узросце важыў 15 кілаграмаў...

У раду музея гісторыі яўрэяў Гродзеншчыны ўваходзяць людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў — гісторыкі, краязнаўцы, музейшчыкі. Яны разам распрацавалі канцэпцыю музея і цяпер, зноў жа сумесна, клапоцяцца аб зборы матэрыялаў і афармленні экспазіцыі.

— Я прыемна здзівіўся, як шчыра, з якой зацікаўленасцю была ўспрынята ідэя стварэння такога музея. Ды і ў аднаўленні сінагогі таксама ўдзельнічаюць людзі розных нацыянальнасцяў. У будынку ўжо зроблена ацяпленне, якога не было шмат гадоў, і цяпер сцены, што «плакалі» ад холаду, пачынаюць адраджацца, — зазначае Беніямін Ерузалім.

У гэтым, дарэчы, ужо пераконваюцца не толькі жыхары горада над Нёманам, але і турысты, якія апошнім часам усё часцей наведваць гродзенскую сінагогу і знаёмяцца з музейнай экспазіцыяй. У будынку сінагогі пад музей прызначаны тры пакоі, а калі іх у будучыні для экспанатаў не хопіць, то ёсць перспектыва выкарыстання размешчанага побач будынка былой яўрэйскай школы, які перададзены абшчыне.

**Арганізатары музея звяртаюцца да ўраджэнцаў Гродзеншчыны, усіх жыхароў Беларусі з просьбай дапамагчы сабраць экспанаты:**

*— Магчыма, у кагосьці захаваліся звязаныя з яўрэйскай культурай старыя фатаграфіі, лісты, дакументы, памятныя знакі, культавыя рэчы, малітоўнікі, творы мастацтва. Не выключана, што хтосьці проста захоча расказаць гісторыю сваёй сям'і. Асабліва цікавіць інфармацыя пра гродзенскае гета і яго вязняў. Тэлефануйце па нумары 7826114 (МТС).*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА**

### СПРАБАВАЎ «ЗВЕСЦІ РАХУНКІ»?

Увечары з апёкамі са сваёй кватэры з жылога дома па сталічным праспекце Газеты «Звязда» шпіталізавалі 51-гадовага пенсіянера, інваліда трэцяй групы па апорна-рухальным апараце. Мяркуецца, што прычына здарэння з ім — спроба суіцыду. Пры высвятленні абставін было ўстаноўлена, што гаспадар кватэры, знаходзячыся каля 23 гадзін вечара ў жылым пакоі ў нецвярозым стане, абліў сябе растваральнікам і падпаліў. Мужчыну даставілі ў бальніцу з апёкамі 1-4 ступені (38% паверхні цела), апёкавай хваробай у стадыі шоку, тэрмаінгаляцыйнай траўмай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

**ПАДПІСКА НА 4-ы КВАРТАЛ 2012 ГОДА**
***Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)***

| *Індэкс* | *месяц* | *квартал* |
|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **24800** | **74400** |
| **63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)** | **22500** | **67500** |
| **63858 (ведамасны)** | **45000** | **135000** |
| **63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)** | **40500** | **121500** |

***Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»***

| *Індэкс* | *месяц* | *квартал* |
|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **20600** | **61800** |
| **63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)** | **18450** | **55350** |
| **63858 (ведамасны)** | **34900** | **104700** |
| **63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)** | **30670** | **92010** |

***Заставайцеся з намі!***

**6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на III кв. або 2–е паўг. 2012 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**


■ Прамая лінія

## СТРАВАВАННЕ БЕЗ ПАКУТ

**Феноменам апошніх гадоў стала змяншэнне колькасці выпадкаў язвы страўніка і 12-перснай кішкі. На тое ёсць аб'ектыўныя прычыны. Па-першае, быў выяўлены мікраарганізм Helicobacter pylori — інфекцыя, якая спрыяе ўзнікненню язвавага дэфекту. Па-другое, медыцына распрацавала стандартныя лекавыя тэсты вынішчэння гэтай інфекцыі. Сучасныя блакатары пратоннай помпы здольныя нейтралізаваць агрэсіўнае страўнікавае асяроддзе. Аднак працягвае заставацца вялікай колькасць хворых з іншымі кіслотазалежнымі паталогіямі — гастраэзафагеяльнай рэфлюкснай хваробай, хранічным панкрэатытам, хранічным гастрытам з эрозіямі. Ад гастраэзафагеяльнай рэфлюкснай хваробы — запалення страваводу — пакутуе дзесьці палова дарослага насельніцтва. Пры гэтай паталогіі страўнікавае змесціва закідваецца ў стрававод і ротавую поласць, адбываецца хімічнае раздражненне слізістай страваводу, развіваецца ацёк, запаленне, эрозія і нават язва. Сур'ёзным застаецца становішча з распаўсюджанасцю хранічных гепатытаў і цырозу. Пашкоджанне печані звязана найперш з ужываннем павышаных доз алкаголю. Аднак захоўваецца і роля вірусаў у фарміраванні гепатытаў B, C і D. Пачасціліся таксама выпадкі лекавых гепатытаў, абумоўленых прыёмам досыць вялікіх доз пэўных лекавых прэпаратаў. Звычайна пашкоджанне печані суправаджаецца жаўтухай склер і скуры, болем у правым падрабрынні, горыччу ў роце.**

**Галоўная прычына паталогіі падстраўнікавай залозы — зноў жа злоўжыванне алкаголем і жоўцекамянёвая хвароба. Камяні, якія аказваюцца ў выводзячых пратоках жоўцевага пузыра і падстраўнікавай залозы, затрымліваюць выдзяленне ферментаў падстраўнікавай залозы і жоўці, што з'яўляецца галоўнай прычынай развіцця хранічнага панкрэатыту і гепатыту. У такіх хворых церпіць страваванне, парушаецца работа кішэчніка, зніжаецца вага, у перыяды абвастрэння з'яўляюцца болі ў верхняй частцы жывата.**





**Варта адзначыць, што за апошнія гады ў лячэбных установах палепшылася тэхнічнае аснашчэнне для дыягностыкі і лячэння гастраэнтэралагічнай паталогіі. З'явіліся сучасныя ўльтрагукавыя апараты, эндаскопы для абследавання полых органаў, а некаторыя сталічныя ўстановы маюць ужо і энтэраскопы для агляду слізістай абалонкі тонкага кішэчніка. На жаль, кароткатэрміновы наркоз, які шырока прымяняецца для правядзення эндаскапічных даследаванняў у замежных клініках, у нас усё яшчэ не даступны. А на вашы пытанні, шаноўныя чытачы, адказалі дацэнты Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдаты медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ і Ірына ШАЛАМІЦКАЯ.**

***☎— Вілейка, Леў Майсеевіч. 82 гады. Ужо шмат гадоў як паставілі дыягназ «язва 12-перснай кішкі». Яна залечаная. Ёсць гастрыт. Цяпер жа пры эндаскапіі выявілі вялікую колькасць жоўці ў страўніку. У чым прычына? Як гэта лячыць?***

— У некаторых пацыентаў язва 12-перснай кішкі спалучаецца з дуадэнагастральным рэфлюксам. Гэты працэс характарызуецца парушэннем перыстальтыкі (рухальнай актыўнасці) і закідам змесціва 12-перснай кішкі (жоўці) у страўнік. Таму ў вашай тэрапіі разам з антысакраторнымі лекавымі сродкамі павінны быць прэпараты, якія рэгулююць натуральны ток жоўці і нармалізуюць рухальную актыўнасць верхняга аддзела страўнікава-кішачнага тракта.

***☎— Мінск, Раіса Францаўна. 52 гады. З юнацтва — хранічны гастрыт, больш за дзесяць гадоў — хранічны халецыстыт. Зараз пры абследаванні ў бальніцы выявілі дыфузнае змяненне печані па тыпе тлушчавага гепатозу. Прыкметы хранічнага халецыстыту засталіся, дадаліся дыфузныя змяненні падстраўнікавай залозы. Хацелася б ведаць, што азначаюць гэтыя дыягназы? Што рабіць далей? У ежы я сябе ўжо моцна абмежавала. Халестэрын быў 7,6 ммоль/л, а цяпер 4,4. Пры росце 158 см вага была 79 кг, цяпер 71.***

— Ультрагукавыя прыкметы хранічнага халецыстыту і панкрэатыту ёсць практычна ва ўсіх пацыентаў ва ўзросце пасля 50 гадоў. Прыкметы — гэта не захворванне. Вы правільна робіце, калі вытрымліваеце гіпахалестэрынавую дыету. Прыемна чуць, што ў вас у выніку гэтага знізіўся ўзровень халестэрыну, вага. Тым не менш, у вас яшчэ захоўваецца лішняя вага і рызыка развіцця захворванняў, звязаных з ёю, істотна павышана. Таму вы пакуль толькі на сярэдзіне шляху. Звяртаем вашу ўвагу на той момант, што нізкакаларыйная дыета ў вашым выпадку павінна быць ладам жыцця, а не курсавым лячэннем.

***☎— Жлобін, Сяргей Васільевіч. 62 гады. Пры эндаскапічным абследаванні выявілі просты жалезісты паліп страўніка з хранічным умерана выражаным запаленнем. Паліп выдалены падчас эндаскапіі. Ёсць таксама хранічны гастрыт, хелікабактар пілары — тры «плюсы». Прапіў курс дэ-нолу, чакаю новага абследавання. Але якія парады па лячэнні можна даць мне ўжо зараз?***

— На жаль, курс дэ-нолу — гэта не метад вынішчэння хелікабактарнай інфекцыі. Сёння ў краіне дзейнічаюць агульнапрынятыя пратаколы лячэння гэтай інфекцыі. Згодна з імі, існуе першая лінія эрадыкацыі (вынішчэння) бактэрыі, якая ўключае аднаасовы прыём трох прэпаратаў (так званая трохкампанентная схема), а пры яе неэфектыўнасці — другая лінія, у склад якой уваходзяць ужо чатыры лекавыя сродкі (чатырохкампанентная схема), у тым ліку і дэ-нол. Акрамя таго, вам неабходна трымацца дыеты. Харчаванне павінна быць чатырохразовым. Варта выдаліць з рацыёну вострыя, смажаныя, вэнджаныя прадукты харчавання. Раніцай ужывайце крупяныя кашы, у абед — супы на ненаварыстым булёне. Пасля правядзення курсу антыбактэрыяльнай тэрапіі, праз месяц, варта пракантраляваць эфектыўнасць вынішчэння бактэрыі. Праз год трэба прайсці паўторнае эндаскапічнае абследаванне страўніка.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
***(Працяг будзе.)***

# Мова — Маці

1(1)

**«Звязда» заўсёды з асаблівай увагай ставіцца да моўных пытанняў і праблем. Таму што мова — жывы арганізм, які сталее і развіваецца на трывалым падмурку — традыцыі. Радзіма—мова—народ: трыадзінства, што спасцігаецца з першымі словамі, пачутымі ад матулі...**

# «Галоўнае, каб любілі беларускую мову...»

**...Еду дадому ў сумным аўтобусе. Стомлены. Абыякава трымаюся за поручань і мару аб тым, як дома нарэшце адпачну.**
**Чую голас. Дзіцячы голас:**
**— Мам, а тут вось замест «стекло» напісалі «шкло»...**
**Дзяўчынка год сямі-васьмі паказвае сваёй маці на шыльдачку «Запасны выхад...»**
**— Гэта па-беларуску, дачушка, — растлумачыла жанчына.**
**— Па-беларуску? — не зразумела дзіця. — А там яшчэ і «пры аварыі» напісана... Гэта ж таксама няправільна. Трэба: «при аварии», — прамовіла дзяўчынка, шчыра не разумеючы «памылак» на шыльдачцы.**




Наўмысна пачаў з гэтага выпадку, які неяк нечакана ўспомніўся. Так бы мовіць, падводжу праблему да жыцця тварам. Вось ёсць у нас і закон аб беларускім правапісе, і Канстытуцыя, якая сцвярджае роўнасць рускай і беларускай моў, у школе ўсе вывучаем родную мову і літаратуру. Здаецца, умовы створаны. Бяры ды размаўляй па-беларуску. Але назіраем мы зусім іншую сітуацыю: справаводства рускамоўнае, мала хто аднолькава валодае і рускай, і беларускай, школ і дзіцячых садкоў беларускамоўных амаль няма. Таму пытанне распаўсюджвання беларускага слова так пакуль і застаецца без выразнага адказу.

Але нядаўна, каля трох месяцаў таму, з'явілася яшчэ адна крыніца, з якой можна спатоліць роднамоўную смагу. У Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны з'явіўся новы сайт у інтэрнэце. Каля тысячы праглядаў штодня, наведнікі з 39 краін свету — гэта першыя поспехі партала. На мінулым тыдні адбылося абмеркаванне гэтых дасягненняў і далейшых напрамкаў укаранення беларускай мовы ў нашым грамадстве.

## Ад ліставання — да міжнароднага супрацоўніцтва

Арганізатары сцвярджаюць, што новы сайт паспрыяў пашырэнню аўдыторыі: тыя, хто ніколі не хадзіў на імпрэзы таварыства, цяпер мае магчымасць даведацца пра іх праз інтэрнэт. Асабліва гэта датычыць моладзі.

Асобны раздзел сайта заняло ліставанне са шматлікімі ўстановамі, якое ўвесь час вядзе таварыства. «Сайт задумваўся з дваякай мэтай. З аднаго боку, візітоўка арганізацыі, а з другога — юрыдычная праца, якую гэта ліставанне добра ілюструе, — патлумачыў **Дзяніс ПТУШЫНСКІ, намеснік старшыні ТБМ.** — Яшчэ адна мэта — наладзіць міжнароднае супрацоўніцтва. Рэальна ўжо пачалася супраца з Еўрапейскім даследчым цэнтрам шматмоўнасці і вывучэння моў «Меркатар». Гэта частка сеткі з пяці даследчых і архіўных цэнтраў, якія займаюцца рэгіянальнымі і меншаснымі мовамі ў Еўрасаюзе. У іх ёсць даччыны сайт, прысвечаны моўнаму заканадаўству. Яны ўключылі цяпер нас у сваю базу звестак. Сумесных праектаў пакуль што не распачалі, але плануем. Вялікай удачай Д. Птушынскі лічыць тое, што ўдалося звязацца з арганізацыяй «Лінгвапакс». «Ёсць Сусветная дэкларацыя лінгвістычных правоў, прынятая ў 1996 годзе. Былі зроблены вялікія намаганні па яе ратыфікацыі ў ЮНЕСКА як дадатку да Дэкларацыі правоў чалавека. Але, на жаль, яна не прайшла, таму што накладвае вельмі вялікія абавязацельствы на нацыянальныя ўрады. Там шмат што трэба рабіць па абароне моў. Так і была створана арганізацыя «Лінгвапакс», якая павінна гэтыя ідэі прасоўваць. Неўзабаве мы пачнём перакладаць іх сайт на беларускую мову, — паведаміў Дзяніс Птушынскі. — Хацелася б, вядома, яшчэ больш рабіць, з яшчэ большай колькасцю арганізацый наладзіць кантакт, але прасоўванне беларускай праблематыкі ў свеце — гэта няпростая справа. І не таму, што яна беларуская, а таму, што нацыянальная».

«Дыялогу з міжнароднымі арганізацыямі вельмі спрыяе амаль поўная перакладзенасць сайта на англійскую мову», — падкрэсліў **Алег Трусаў, старшыня ТБМ.** Таксама ён засяродзіў увагу на тым, што цяпер кожная з рэгіянальных суполак таварыства мае фактычна свой сайт і можа выкладваць туды ўсе свае матэрыялы. А ў выніку ўсе яны становяцца дасяжнымі для ўсёй Беларусі. Акрамя таго, на сайце можна знайсці ўсе выданні ТБМ, а значыць беларус у любым кутку свету можа іх пачытаць.

## Пры сутыкненні з праблемай трэба яе вырашаць

Таварыства спадзяецца, што сайт дазволіць выяўляць і вырашаць розныя праблемы, якія ўзнікаюць у беларусаў з ужываннем беларускай мовы. Так, напрыклад, пастаянна дзейнічае «Бацькоўскі камітэт», дзе абмяркоўваецца магчымасць навучання дзяцей у беларускамоўным класе ці адпраўкі іх у беларускамоўную групу ў дзіцячым садку. «Галоўная наша задача — маніторыць моўныя правы, — упэўнена **Алена Анісім, першы намеснік старшыні ТБМ.** — Пры з'яўленні нейкіх цяжкасцяў спрабуем вырашаць іх сваімі сіламі. Напрыклад, сутыкнуліся мы з тым, што правілаў дарожнага руху на беларускай мове, нягледзячы на абвешчаную роўнасць моў, няма. Пяць гадоў мы ліставаліся на гэты конт, але ў адказ прыходзілі толькі абяцанні. Тады мы знайшлі магчымасць закрыць гэтае пытанне сваімі грамадскімі сіламі. Так мы зрабілі пераклад правілаў».

## Беларуская — гэта еўрапейская мова

А значыць, і выкладацца яна павінна па ўсіх еўрапейскіх стандартах. Такой думкі прытрымліваецца Алена Анісім: «Мы зацікаўлены ў выкарыстанні досведу замежных калег у навучанні беларускай мове, каб абагуліць яго і зрабіць для нашай мовы еўрапейскі стандарт. Таму што гаварыць, што беларуская мова роўная, можна будзе толькі тады, калі мы «закрыем» пэўныя нішы. Сёння чалавек можа навучацца беларускай мове, але, на жаль, ніякага дакумента, заканадаўча афармленага, пасля гэтага не выдаецца. Патрэбен сертыфікат, дзе будзе напісана, што чалавек валодае мовай у пэўным аб'ёме. Гэта наша стратэгічная задача. Наяўнасць такога сертыфіката ўзвысіць Беларусь на міжнародным узроўні». Дапамогі ў таварыстве чакаюць, напрыклад, ад сусветна вядомага Інстытута славістыкі Польскай Акадэміі навук, з якім таксама пачалі супрацоўнічаць.

## Галоўнае — любіць мову

«Праз сайт, дзякуючы ў тым ліку і англамоўнаму перакладу, увесь свет даведаецца, што мова наша вымірацьне збіраецца, што яна моцная, што ва ўсіх сферах жыцця дзейнічае, — заявіў Алег Трусаў. — Мы падтрымліваем любыя беларускамоўныя пачынанні. Мы не дзелім людзей на партыі, канфесіі, нацыянальнасці: галоўнае, каб любілі беларускую мову. Для такіх людзей партал і ствараўся». **Ніна Шыдлоўская, старшыня МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»,** таксама пацвердзіла важнасць аб'яднання аматараў мовы: «Адкрыццё гэтага сайта — доўгачаканая падзея. Асабліва таму, што для нашых сяброў з замежжа дужа важна знайсці спецыфічную інфармацыю і адчуваць пэўную еднасць. А яшчэ — гэта абсалютна сучасны сайт, які, найперш дазволіць заахвочваць моладзь. Трэба толькі напоўніць яго яшчэ тымі цікавосткамі, якія прываблялць маладых».

Далучайцеся і вы, чытачы. Тым больш, што вам ёсць з каго браць прыклад. Апошнім часам многія камерцыйныя кампаніі сталі рэкламаваць сябе па-беларуску і перакладаць свае сайты на беларускую мову. Яны пачалі разумець, што гэта важна. І вы разумееце, я веру. Толькі часта проста саромеецеся быць першым у сваім асяроддзі. Зайдзіце на сайт tbm-mova.by — і зразумейце, што вы не адзін. А то пасля будзе сорамна за тое, што вашы дзеці стануць лічыць беларускую мову «памылковай»...

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ПРАФЕСАР РОДНАГА СЛОВА

**Цяпло і святло слова, нібы матчына далонь і ўсмешка, могуць саграваць і абпраменьваць жыццё чалавека, калі ён шчыры і ўспрымальны, даверлівы і бескарыслівы, чуллівы і дапытлівы... Але і яно, слова, мае патрэбу ў штодзённай увазе да яго, каб падсілкоўвацца дзеля заўсёднай магутнасці цяпла і інтэнсіўнасці святла і каб як мага мацней кранаць душу сваёй неўміручай мілагучнасцю і меладычнасцю. Якраз тыя, хто дбае пра гэтае слова, завіхаецца ў яго родным куточку з найменнем мова, становяцца адмысловымі рупліўцамі захавання яго чысціні і незамутнеласці.**



Гэтыя развагі цалкам стасуюцца з жыццём і дзейнасцю Віктара Іўчанкава, 50-годдзе якога выпадае на сёння. Здавалася б, выпястоўцу Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута імя А.С. Пушкіна з дыпломам па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура» ў 1985 годзе варта было б застацца на трывалым падмурку навуковых росшукаў расійскіх лінгвістаў і плённа працаваць у гэтым кірунку. Але, відаць, цяпло і святло менавіта роднага слова вабілі мацней, і на мовазнаўчым беларускім палетку пачалі з'яўляцца парасткі, узрошчаныя клопатам сённяшняга юбіляра. Гэтаму прынамсі паспрыялі і першыя навуковыя зацікаўленасці маладога даследчыка, звязаныя з творчасцю Уладзіміра Караткевіча, моўная палітра якой праз адмысловую вобразную сістэму разгортвае нацыянальную карціну свету, выяўляючы менталітэт народа, і стасункі з вядомымі беларускімі навукоўцамі Аляксандрам Булыкам, Сцяпанам Грабчыкавым, Аркадзем Наркевічам, Міхасём Цікоцкім...

Пачатак педагагічнай і навуковай дзейнасці Віктара Іўчанкава прыпадае на 1980—90-я гады. Узначаліўшы адзіную ў беларускіх універсітэтах кафедру стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, ён плённа прадоўжыў працу яе заснавальніка Міхася Цікоцкага. Паступова сфера навуковых клопатаў Віктара Іванавіча пашыраецца на журналісцкі тэкст, які даследуецца з сучасных пазіцый дыскурснага аналізу. Менавіта Віктар Іўчанкаў запачаткаваў гэты навуковы кірунак у беларускай лінгвістыцы і ў 2003 годзе выдаў манаграфію «Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту», якая да сёння не страціла сваёй актуальнасці і запатрабаванасці. Невыпадкова навуковец і педагог дзеля пашырэння камунікатыўных кампетэнцый студэнтаў Інстытута журналістыкі БДУ зусім лагічна звяртаецца да медыярыторыкі і рыхтуе для іх курс лекцый па гэтай дысцыпліне (2009). Ужо на працягу больш чым дваццаці гадоў будучыя журналісты слухаюць яго лекцыі па розных дысцыплінах, захапляюцца ўменнем наладзіць дыялог, праявіць педагагічны талент і нават акцёрскія здольнасці, а калі трэба — і прынцыповасць.

Педагагічная і навуковая дзейнасць юбіляра арганічна суіснуюць і, здаецца, непарыўныя. Калі напрыканцы XX стагоддзя распачалася дыскусія пра наспелыя змены ў беларускім правапісе, Віктар Іўчанкаў стаў сустаршынёй адпаведнай камісіі і выступаў ад імя выкладчыцкай і настаўніцкай супольнасці. Гэтая праца прынесла плён у 2008 годзе ў выглядзе закона «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Цяжка нават уявіць, колькі спрэчак выклікалі пэўныя арфаграмы, як доўга трэба было даводзіць свой пункт гледжання, якія фізічныя і маральныя высілкі выдаткаваныя ў той час. Адзначым тут важкую ролю «Звязды», якая выступіла эксперыментальнай пляцоўкай апрабацыі новых нормаў яшчэ да прыняцця закона, што паспрыяла больш удумліваму і навукова абгрунтаванаму падыходу да іх кадыфікацыі. А Віктар Іўчанкаў, разумеючы патрэбу беларускай школы ў новых падручніках, рыхтуе дапаможнік «Беларуская мова ў табліцах і схемах», які вытрымаў некалькі выданняў. Новае слова Віктара Іўчанкава прагучала і ў яго кнізе «Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі» (2010) — своеасаблівым роздуме навукоўца над праблемамі арфаграфічнай унармаванасці роднай мовы.

Штодзённая праца над словам, выкарыстаным у СМІ, бацькоўскія клопаты пра сваіх калег і студэнтаў, падрыхтоўка навуковых кадраў, удзел у разнастайных саветах і камісіях, шырокія навуковыя стасункі з профільнымі кафедрамі Маскоўскага, Санкт-Пецярбургскага, Кіеўскага, Луганскага і іншых універсітэтаў, — на ўсё, здаецца, хапае часу ў шаноўнага прафесара. Заканамернай уяўляецца і прэмія «Залатое пяро», прысуджаная яму ўжо і як журналісту за серыю публікацый у беларускай прэсе па пытаннях культуры беларускай мовы, і найвышэйшая прэмія імя У. Пічэты галоўнага ўніверсітэта краіны.

Доктар філалагічных навук, прафесар, выдатнік адукацыі, лаўрэат разнастайных прэмій, Віктар Іўчанкаў і сёння ў пошуку свайго слова ў навуцы. Пяцьдзясят гадоў — самы росквіт творчага патэнцыялу навукоўцы. Добразычлівасць, спагадлівасць, прыстойнасць і багаты навуковы досвед, шырокі кругагляд, адметны падыход — гэтыя чалавечыя і прафесійныя якасці заўсёды вабяць да Віктара Іўчанкава людзей самага рознага сацыяльнага статусу і поглядаў. І, што важна, ён заўсёды лічыць патрэбным знайсці час для гутаркі, дапамагчы, патлумачыць, пераканаць, каб суразмоўца пайшоў, задаволены сустрэчай.

Цяпло і святло слова... роднага слова сілкуюць жыватворным натхненнем нашага прафесара Віктара Іўчанкава. Няхай жа яно пад яго дбайным клопатам жыве на беларускай зямлі вечна.

**Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ.**

■ Ведай нашых!

Андрусь ТАКІНДАНГ:

# «НАДЗЯВАЎ БЕЛУЮ КАШУЛЮ, АПРАНАЎ ЧОРНЫ ПІНЖАК, КАБ ПІСАЦЬ ВЕРШЫ...»

**Ён аднолькава добра праяўляе сябе ў жывапісе, паэзіі, музыцы, раніцай на АНТ апавядае пра асаблівасці беларускай мовы, з'яўляецца цікавай асобай і шчырым суразмоўцам. Са слоў Андруся, у жыцці яму дапамагаюць дзіцячыя мары, якія зараз ён з поспехам ажыццяўляе. Пра гэта і не толькі малады чалавек з задавальненнем згадзіўся расказаць чытачам газеты.**



***— Зараз у СМІ і інтэрнэце вельмі актыўна абмяркоўваецца перадача з вашым удзелам на АНТ. Чаму навучыў гэты праект асабіста вас?***

— Ён даў мне досвед новай прафесіі. Камера адрозніваецца ад сцэны, і праца вядучага прад'яўляе свае патрабаванні. Я стаў больш мабільным, арганізаваным.

***— Калі вы ўпершыню адчулі жаданне нешта стварыць? З чаго пачыналі?***

— Пачынаў, як і ўсе дзеці, з малюнкаў: ствараў абстракцыі. Напісанне вершаў для мяне ўвогуле было сапраўдным рытуалам. Успамінаю, як надзяваў белую кашулю, апранаў чорны пінжак і з узнёслым настроем сядаў за стол, каб выкласці свае думкі ў форме вершаў на паперы.

***— Андрусь, вы мастак, вядучы, паэт, музыкант. Якое з захапленняў для вас вызначальнае?***

— Зараз я шмат часу прысвячаю музыцы. Адчуваю патрэбу менавіта ў гэтым відзе мастацтва.

***— Якую з творчых вяршынь скарыць цяжэй за ўсё?***

— Каб дасягнуць поспехаў у любой справе, патрэбен час. Аднак з музыкай складаней, бо гэта калектыўны від дзейнасці, і вынік залежыць не толькі ад цябе аднаго. Калі ж казаць пра жывапіс, то ты малюеш тады, калі табе зручна. Тут усё ў тваіх уласных руках. З паэтычнымі творамі ў гэтым плане яшчэ прасцей: яны нараджаюцца, калі прыходзіць натхненне.

***— І дзе яно вас звычайна сустракае?***

— Часцей за ўсё ў дарозе. Іншы раз глядзіш у акно, пра нешта думаеш, і ў выніку нараджаецца верш.

***— Ці быў у вас творчы крызіс?***

— Так, падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў, якая ў нейкім сэнсе «ціснула на свабоду». Я шмат «заганяўся», вельмі крытычна ставіўся да ўласных работ... Часам трэба зрабіць крок убок. Паглядзець на сваю працу вачыма іншага чалавека.

***— Зараз вы з'яўляецеся салістам гурта «Рэха» і мастацкім кіраўніком «Гаротніцы». Як удаецца сумяшчаць гэтыя два праекты? Якому з іх аддаяце больш часу?***

— У розныя перыяды па-рознаму. На пачатку стварэння «Гаротніцы» шмат працаваў над новым калектывам. Туды прыйшла салістка Валерыя Валадзько, якая ўсклала на свае жаночыя плечы большасць арганізацыйных і адміністрацыйных пытанняў, таму за гэты гурт я спакойны. З'явілася больш часу для «Рэха».

***— Ці карыстаецца папулярнасцю музыка, якую вы ствараеце? Ці запатрабаваны ў Беларусі такія музычныя калектывы, як «Рэха» і «Гаротніца»?***

— Кожная музыка знаходзіць свайго слухача. Мы таксама маем сваю аўдыторыю. Часта ладзім канцэрты ў клубах, на вуліцы, выступаем з гастролямі за мяжой. Песні «Гаротніцы» гучаць у дакументальнай кінастужцы Галіны Адамовіч «Маляваны рай». Калі ж казаць пра музыку ў цэлым, то ёсць два напрамкі: музыка альтэрнатыўная і музыка папулярная. Мы больш адносімся да першага накірунку, хоць зараз «Рэха» пaступова сцірае гэтыя межы.

***— Пры знаёмстве з вашай творчасцю наткнулася на цікавыя радкі: «Прыжаніцца бы мне ў правінцыі з маладою цырульніцай увішнаю...» Няўжо дзяўчына, каб вам спадабацца, абавязкова павінна быць цырульніцай?***

— Вядома ж, не! *(Смяецца)* Гэты верш іранічны: спроба намаляваць ідэалістычную карціну. Цырульніца — цікавы збіральны вобраз. Насамрэч, прафесія для мяне — зусім не вызначальны фактар. Калі толькі не казаць пра дзяўчыну-кілера.

***— Многія вашы карціны напісаны на рэлігійную тэматыку. Якое месца ў вашым жыцці займае вера?***

— Бог — аснова ўсяго. Як той казаў, «без Бога не да парога». У маім сэрцы ёсць вобраз ідэальнага, правільнага жыцця з Богам. Я не заўсёды жыву згодна з ім, але ведаю, якім я магу і павінен быць, і імкнуся да гэтага.

***— Вам даводзіцца шмат працаваць. Як вы адпачываеце?***

— Па-рознаму. Магу, напрыклад, нічога не рабіць... Наша праца творчая, таму часта я проста змяняю заняткі: пераходжу ад музыкі да жывапісу, ад жывапісу да паэзіі. Заўсёды з ахвотай хаджу на канцэрты сяброў. Таксама люблю фізічную працу. З задавальненнем наведваю сваю бабулю і дапамагаю ёй па гаспадарцы.

***— Зараз вы даволі вядомая асоба ў Беларусі, пра вас пішуць у газетах, вас запрашаюць паўдзельнічаць у розных праектах. Якім вы бачыце Андруся Такінданга праз дзесяць гадоў?***

— Сівым *(смяецца)*. Хачу не страціць радасць, захаваць бадзёрасць, Стаць больш мудрым.

**Настасся БАРШЧЭЎСКАЯ**

■ Моўныя актуаліі

# МЁРЫ ЦІ МІЁРЫ?

**«Міёры» — шыльдачка з такой назвай сустракае жыхароў і гасцей раённага цэнтра Віцебскай вобласці. Выкрасліць з яе адну літару — збльтаць падарожніка са шляху, «прапісаць» мясцовых жыхароў у іншым горадзе, знайсці месца на карце Беларусі новаму населенаму пункту...**

**Аднак некаторыя навукоўцы лічаць па-іншаму. Маўляў, назва ў горада не беларуская. І маюць рацыю. А можа, у мясцовых жыхароў свая праўда?**

**Рэдакцыя газеты «Звязда» вырашыла правесці сваё «моўнае» расследаванне. І на гэта былі падставы: афіцыйная назва горада ў даведніку «Назвы населеных пунктаў Беларусі. Віцебская вобласць» — Мёры; у той жа час ва ўсіх дакументах, на шыльдах устаноў раённага цэнтра, нават на ўзроўні штодзённага ўяўлення існуе зусім іншае найменне — Міёры.**

**Дык хто ж дапускае памылку? Каб разабрацца ў гэтым, паслухаем навукоўцаў і саміх мясцовых жыхароў.**

## З пункту гледжання навукоўцы...

Тапонімы называюць своеасаблівым летапісам зямлі: многія з іх дайшлі да нас з глыбіні стагоддзяў і тысячагоддзяў, ствараліся ў розныя гістарычныя эпохі і перадаваліся з пакалення ў пакаленне, таму іх асновы дазваляюць прасачыць старажытныя намінатыўныя тэндэнцыі і аднавіць гісторыка-культурныя зрэзы. Даволі часта здаралася так, што гістарычныя абставіны накладвалі адбітак на форму напісання ўласнай геаграфічнай назвы, і на працягу свайго існавання адно і тое ж найменне магло мець некалькі арфаграфічных варыянтаў. Не стала ў гэтым плане выключэннем і назва аднаго з раённых цэнтраў Віцебскай вобласці — Мёры. У розных крыніцах у розныя гістарычныя перыяды гэтая назва мела рознае напісанне. Упершыню ў пісьмовых крыніцах 1514 года гэтае месца ўпамінаецца як маёнтак Мярэя Браслаўскага павета Вялікага Княства Літоўскага. Пазней у перапісе ВКЛ 1567 года маёнтак значыцца як Меры, Мёры. Гэтая форма паслядоўна ўжывалася ў большасці старабеларускіх дакументаў ВКЛ. Так, у духоўным тэстаменце 1621 года (Акты Віленскай археаграфічнай камісіі, т. 33, с. 204) запісана: *«Мають сынове мои Миколай, Александер и Федор Шымановичы Мерские... а деткам моим, а если прыбудуть... без проволоки поховати тело мое в церкви заложенья нового над озером, в ыменю Мерах, в повете Браславском лежачом.* Па сведчанні гісторыкаў, назва *Мёры* існавала аж да XIX стагоддзя (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 5, с. 131). Непрацяглы час у дакументах выкарыстоўвалася формы *Міры*. На польскамоўных картах XVII — XVIII стст. назва мястэчка пісалася як *Miory*. Такая форма напісання абумоўлена тым, што беларускай літары ё ў польскай мове адпавядае спалучэнне літар *io*. Пазней, калі беларускія землі адышлі да Расійскай імперыі, расійскія картографы памылкова кірылічнай графікай палітарна перадалі з польскай мовы спалучэнне *io* праз *ио*. У выніку назва змяніла сваю форму з *Мёры* на *Миоры* (па беларуску *Міёры*). І вось гэтая чужамоўная, скажоная, з неўласцівымі для беларускай мовы гукавымі рысамі форма напісання назвы ўжываецца больш за два стагоддзі.

На сучасным этапе поруч з афіцыйнай формай *Міёры* даволі часта ў сродках масавай інфармацыі, у навуковай літарутуры ды і ў вусным маўленні прадстаўнікоў старэйшага пакалення беларусаў ужываецца форма *Мёры*. Натуральна, што ў многіх узнікае пытанне, дзе ж гістарычная праўда, якім павінна быць сучаснае найменне беларускага паселішча — *Мёры* ці *Міёры*? Атрымаць адказ на гэтае пытанне магла б дапамагчы этымалогія (паходжанне) назвы. Але да сённяшняга дня не існуе адзінай версіі паходжання: адны вучоныя звязваюць гэтую назву з фіна-ўгорскім гідранімічным фармантам *jarvi*, што азначае возера (Р. Аўчыннікава); другія мяркуюць, што назва горада паходзіць ад прозвішча Маер, Меер (В. Жучкевіч); трэція звязваюць тапонім з уладальнікамі паселішча князямі Мірскімі; чацвёртыя — са старажытным словам *мір* у значэнні *абшчына*. Не меншую колькасць версій змяшчаюць і народныя легенды. Паводле народнай этымалогіі, гэтае месца атрымала такую назву ў сувязі з вялікім морам: ад невядомай хваробы памерла ўсё насельніцтва краю. Іншыя тлумачаць назву горада назвай канавы *Мерыца*, якая служыла мяжой паміж уладаннямі ад Мёрскага возера да Заходняй Дзвіны. Акрамя таго, існуе прыгожае паданне пра князя Меру і яго жонку Мерыцу, ад імёнаў якіх і пайшла назва месца. І ўсё ж большасць даследчыкаў сыходзіцца на думцы, што паходжанне назвы *Мёры* або *Меры* зязана з фіна-ўгорскім племем мера, мер, што мае пад сабой падставы, паколькі фіна-ўгры сапраўды пакінулі глыбокі след у тапаніміі гэтай тэрыторыі. На нашу думку, разгадку назвы трэба шукаць у самым старажытным, першасным варыянце назвы *Мярэя*, якая, хутчэй за ўсё, паходзіць ад фіна-ўгорскай назвы аднайменнай ракі.



Напэўна, прыйдзе час, калі вучоныя змогуць больш-менш дакладна вызначыцца з паходжаннем назвы. А што тычыцца сучаснай яе формы напісання, то можна адназначна сцвярджаць, што яна памылковая. Аналагічная сітуацыя адбывалася і з назвай яшчэ аднаго райцэнтра Віцебскай вобласці — *Лёзна*. Доўгі час у афіцыйных дакументах пісалі Ліёзна (па-руску Лиозно). Але мясцовыя ўлады ўлічылі думку вучоных і ў канцы XX стагоддзя замацавалі ў пісьмовым афіцыйным ужыванні старажытную нацыянальную форму *Лёзна*, якая актыўна ўвайшла ў моўную практыку. Варта было б аналагічным чынам паступіць і з назвай *Мёры*. Тым больш, што для гэтага ёсць юрыдычная база: у 2009 годзе вучонымі Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі быў створаны даведнік «Назвы населеных пунктаў Беларусі. Віцебская вобласць», у якім у якасці афіцыйнай прынята форма Мёры. Гэты даведнік мае статус нарматыўнага, ён узгоднены з Тапанімічнай камісіяй пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, зацверджаны Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь у якасці нарматыўнага выдання, прызначанага для выкарыстання рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь. Зразумела, што некаторыя жыхары раёна, асабліва прадстаўнікі маладога пакалення, прывыклі да назвы Міёры. Але хіба можна моладзь выхоўваць на памылках? Памылкі неабходна выпраўляць. Вядома, што змена адной літары ў найменні пацягне за сабой пэўныя матэрыяльныя выдаткі. Але ці не большыя духоўныя выдаткі мы пацерпім ад страты гістарычнай памяці і нацыянальнай самабытнасці?

**Ігар КАПЫЛОЎ, вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**

■ Голас народа

## У адной літары справа

**З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ МЯСЦОВЫХ ЖЫХАРОЎ...**

**Леанід МАЦЯЛЁНАК, галоўны рэдактар газеты «Міёрскія навіны»:**

— Сённяшняя афіцыйная назва нашага горада — Міёры — не з'яўляецца беларускай. Спалучэнне «іё» прыйшло да нас з Польшчы. Значыць, і назва —запазычанне. Таму я не супраць, каб яе змяніць. Больш за тое, гадоў 15—20 таму сам у газеце ўзнімаў гэтае пытанне. Аднак тыя публікацыі пэўнага выніку не прынеслі. Тым больш, і добрая магчымасць у той час была, каб змяніць назву: у 1998 годзе выдавалася кніга «Памяць», у якой можна было б замацаваць новую назву. Але толькі пагаманілі — і перасталі.

**Аксана ЛАГУНЁНАК, в. а. дырэктара Міёрскага гісторыка-этнаграфічнага музея:**

— Спрачацца з навукоўцамі я не буду. Можа, назва Мёры і больш правільная. Толькі ці ў арфаграфіі тут справа? Усё значна глыбей: у падсвядомасці народа, у яго культуры, традыцыях. І ці варта мяняць назву, калі мы прывыклі да сучаснай, калі мы ўсё роўна, нягледзячы на яе форму напісання, будзем думаць па-іншаму? Тым больш, ці каштуе адна «лішняя» літара ў найменні тых матэрыяльных выдаткаў, якія яна за сабой пацягне? Думаю, гэтыя грошы варта ўкласці ў іншую, больш карысную і канкрэтную справу.

**Вольга ФЕДУКОВІЧ, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 3 горада Міёры, выкладчык беларускай мовы і літаратуры:**

— Колькі я памятаю, дык у нас увесь час вядуцца спрэчкі наконт назвы населенага пункта. Вядома, да наймення Міёры мы прызвычаіліся, нягледзячы на тое, што ўжо даўно абгрунтавана яго памылковасць. А з грамацеямі не паспрачаешся. Уласна кажучы, мне асабіста сімпатычны варыянт — *Мёры*. Гэтая назва ўжо ўкаранілася ў гаворцы міёрцаў, лашчыць слых. Так размаўлялі мае бацькі, так кажу я, так гавораць мае дзеці. Незалежна ад таго, як абгрунтавалі назву навукоўцы, мне імпануе спрадвечная гістарычная назва. Прыгожая, мілагучная, пяшчотная... Ні ў якім разе яна не асацыюецца ў мяне са словам «паміраць».

**Таццяна СТАЛЬМАЧОНАК, начальнік аддзела ідэалагічнай работы Міёрскага райвыканкама:**

— Першапачаткова наш горад называўся Мёры. Аднак, улічваючы тое, што нарадзілася я ў Міёрскім раёне, зараз жыву ў Міёрах, мне і бліжэй сучасная назва. Упэўнена, што не адна я прывыкла да яе. Толькі нас ніхто не пытае, якая назва больш даспадобы і ці трэба яе змяняць. Таму, перш чым нешта рабіць, мэтазгодна параіцца з мясцовымі жыхарамі і ўдакладніць, у якім горадзе яны хочуць жыць — у Міёрах ці Мёрах.

**Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

***Ад рэдакцыі.*** *Пытанне застаецца адкрытым. Цікава, а што на гэты конт думаеце вы, шаноўныя чытачы? Калі ласка, дасылайце свае меркаванні на адрас ці на электронную пошту «Звязды».*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С УСЛОВИЯМИ

**по продаже неиспользуемых объектов, находящихся в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине**

**Аукцион состоится 26 июля 2012 г. в 11.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 8(0222)311185, 223375, 229022.

Продавец неиспользуемого имущества – РУП «Могилевское отделение БелЖД», тел.: 8(0222) 392665, 393719.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 11 декабря 2009 г. № 622».

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни в фонде «Могилевоблимущество» с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **24 июля 2012 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **26 июля 2012 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о неиспользуемом имуществе: Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена, базовых величин* | Информация о земельном участке: Площадь, га | Срок аренды, лет | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Здание усилительного пункта связи одноэтажное, кирпичное, 124,8 кв.м | Могилевская обл., Белыничский р-н, Техтинский сельсовет, дер. Станция Друть | 1 | 0,0987 | 50 | 100,0 |

** Начальная цена продажи входящего в состав лота неиспользуемого имущества определяется исходя из размера базовой величины, установленного законодательством на дату проведения аукциона.*

Обязательные условия для покупателя:

– осуществление покупателем предпринимательской деятельности на отчуждаемом объекте; создание не менее одного рабочего места;

– открытие производства не позднее одного года с момента приобретения объекта;

– запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Условия для победителя аукциона в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания неиспользуемого имущества: в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенного на аукционе здания).

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 15 ноября 2011 г.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка.

Срок заключения договора купли-продажи неиспользуемого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за неиспользуемое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **region.mogilev.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Трактор МТЗ 1221, 1999 года выпуска, гос. № 6534 БХ (разукомплектован). Стоимость – 10 522 000 рублей. **Лот № 2.** Автомобиль ЗИЛ-131, 1983 года выпуска, гос. № АА 1022-2. Стоимость – 24 798 000 рублей. **Лот № 3.** Автомобиль УРАЛ-4320, 1991 года выпуска, гос. № ВА 5067. Стоимость – 23 683 000 рублей; |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Докшицкий райагросервис» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, г. Докшицы, ул. К. Маркса, 35 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 304 **18 июля 2012 года в 11.30** |
| **Информация об обременениях** | Обременений нет |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 304 http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11 Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 17.07.2012. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Автомобиль ЗИЛ 494560 АГП-22, 2003 года выпуска, гос. № АВ 1806-2. Стоимость – 146 775 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | РСЧУП «Теплотехник-Орша» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Могилевская область, г. Горки, ул. Мира, база ОДО «Альфа-Зет» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 304 **25 июля 2012 года в 11.30** |
| **Информация об обременениях** | Обременений нет |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 304 http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11 Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 24.07.2012. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Сосновая Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **10 августа 2012 года в 11.00,** аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,1155 га (по генплану № 54) № 624883010101000362, д. Сосновая<br>Лот № 2 — площадь 0,1128 га (по генплану № 55) № 624883010101000363, д. Сосновая<br>Лот № 3 — площадь 0,1057 га (по генплану № 56) № 624883010101000364, д. Сосновая<br>Лот № 4 — площадь 0,1073 га (по генплану № 57) № 624883010101000365, д. Сосновая |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 2 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 3 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 4 — 60 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Сосновая – нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждый вторник в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | **Окончательный срок приема документов** | 06 августа 2012 года в 17.00 |
| 14 | **Контактные телефоны** | 8 (01776) 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## Администрация Октябрьского района г. Минска ПРИГЛАШАЕТ ЖИТЕЛЕЙ РАЙОНА с 10.07.2012 по 30.07.2012 ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ОБЩЕСТВЕННОМ ОБСУЖДЕНИИ ПРОЕКТА «Многоквартирный жилой дом по ул. Кижеватова».

Презентация эскизного проекта состоится **09.07.2012** года в 18.30 в здании УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» по адресу: г. Минск, ул. Могилевская, 2 корпус 2, 1-й этаж, зал заседаний.

Обсуждение будет проводиться путем экспозиции с **10.07.2012** по **30.07.2012** в холле здания ЖЭУ-63 «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» по адресу г. Минск, ул.Кижеватова, 66, ежедневно (кроме выходных) с 8.45 до 18.00, пятница с 8.45 до 16.45.

Встреча комиссии с населением состоится **26.07.2012** в 16.00 в здания ЖЭУ-63 «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» по адресу: г. Минск, ул. Кижеватова, 66.

Представитель организатора – отдел архитектуры и градостроительства, отдел строительства администрации Октябрьского района г. Минска, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 6, каб. 315, 312, 317, телефоны: 224 47 12, 220 39 31.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Сосновая Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **31 июля 2012 года в 11.00,** аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,1097 га (по генплану № 51) № 624883010101000359, д. Сосновая<br>Лот № 2 — площадь 0,1148 га (по генплану № 52) № 624883010101000360, д. Сосновая<br>Лот № 3 — площадь 0,1102 га (по генплану № 53) № 624883010101000361, д. Сосновая |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 2 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 3 — 60 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Сосновая – нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждый вторник в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | **Окончательный срок приема документов** | 25 июля 2012 года в 17.00 |
| 14 | **Контактные телефоны** | 8 (01776) 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ» 220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327 52 36, 226 03 01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2006 по 2011 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 40, ул. Есенина, д. 42, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52, д. 72, ул. Папанина, д. 18, ул. Стариновская, д. 2, ул. Колесникова, д. 16, д. 18, д. 20.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Многоэтажные жилые дома № 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». (2 пусковой комплекс).**

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-2184 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 16 апреля 2010 г.

Земельный участок площадью 1,0046 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание 2 пускового комплекса жилого дома запроектировано из 13-этажной секции. Количество жилых помещений 2 пускового комплекса жилого дома – 66. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства жилого дома – октябрь 2010 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – январь 2013 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 03.05.2010 № 169-15/10 с дополнением № 387-15/11 от 14.06.2011.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир с № 208 по № 267.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет: 1-комнатные квартиры – 11 901 711 руб.; 2-комнатные квартиры – 11 477 243 руб.; 3-комнатные квартиры – 11 052 775 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 28.09.2010 № 25, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 1».

Принятие и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации в каб. 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ» 220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327 44 76, 327 65 53**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2005 по 2010 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Многоэтажные жилые дома № 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану».**

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-2184 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 16 апреля 2010 г.

Земельный участок площадью 1,0046 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из семи 13-14-этажных секций. На первом этаже жилого дома в секциях № 1 – № 2 запроектирован продовольственный магазин, в секциях № 3 – № 7 запроектированы 9 встроенных помещений административно-общественного назначения, аптека. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства жилого дома – октябрь 2010 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – январь 2013 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 03.05.2010 № 169-15/10 с дополнением № 387-15/11 от 14.06.2011.

Договор создания объекта долевого строительства будет заключаться на строительство нежилого помещения (аптеки) полезной площадью 145,1 $м^2$.

Предметом договора будет являться строительство нежилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади аптеки без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 25 633 330 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 28.09.2010 № 25, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 1».

Принятие и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве нежилых помещений будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации в каб. 401, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** склад продовольственных товаров № 1 (составные части и принадлежности: рампа бетонная, козырьки входов 5 шт., ограждение рампы, переходной мост), инвентарный номер 644/С-34916, об. пл. 1604,9 кв.м, расположенный по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, р-н Станции «Калий-1», уч. 5. **Начальная цена с НДС – 1 521 236 400 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,5314 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования). Объект обременен договором аренды (часть строения пл. 140 кв.м в аренде по 14.07.2013).

**Лот № 2:** мебельный склад, инвентарный номер 644/С-34933, об. пл. 972,9 кв.м, расположенный по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, р-н Станции «Калий-1», уч. 5. **Начальная цена с НДС – 875 748 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,3498 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Лот № 3:** здание склада для хранения пиломатериалов, инв. № 644/С-34935, об. пл. 491,8 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, Солигорский район, район станции «Калий-1». **Начальная цена с НДС – 608 214 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,8989 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования). Объект обременен договором аренды (по 01.08.2013 г.).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

